# Рэчыца прымае гасцей

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Горад вельмі прыгожы і ўтульны ў сваім святочным убранні, у барвах залатой восені. Еўрапейскі стыль, можна сказаць. Шмат новых аб'ектаў з'явілася тут, шмат адрамантавана і рэканструявана. Чатыры тысячы будаўнікоў з Гомельшчыны і ўсіх абласцей рэспублікі завіхаліся над імі, бо ў спісе значылася, лічы, каля пяцісот тых аб'ектаў жыллёвай, сацыяльна-бытавой і культурнай сфер. Усяго было запланавана ажыццявіць 320 мерапрыемстваў на агульную суму 182 млрд рублёў, і ўсе яны выкананыя. Нярэдка з апярэджаннем тэрмінаў дзякуючы своечасоваму фінансаванню, старанню ўдзельнікаў будаўніцтва і аператыўным дзеянням рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта, які ўзначальваў намеснік прэм'ер-міністра Іван Бамбіза.

З'явіліся дзве буйныя новабудоўлі: летні амфітэатр, які ўжо сёння параўноўваюць з віцебскім, дзе штогод праводзіцца славуты «Славянскі базар», і аўтамабільны пуцеправод цераз чыгунку. Дарэчы, на апошнім аб'екце, які мае вялікае значэнне не толькі для горада, а і вобласці ў цэлым, тэрміны будаўніцтва былі скарочаны ў два з паловай разы і атрымана эканомія ў суме больш за адзін мільярд рублёў.

Вось што значыць талака!

Абнавіўся і чыгуначны вакзал, каля якога ўстанавілі стары паравоз. А на крутым беразе Дняпра сумеснымі намаганнямі адкрытага акцыянернага таварыства «Рэчыцарамбуд», Мазырскага «Нафтазаводмантажа» і нямецкай фірмы пабудаваны атракцыён пад назвай «Альпійская горка». Тут бавяць час аматары катання на санках, якое ў нечым нагадвае сабой алімпійскі від спорту — бобслей. Уявіце сабе, што вышыня спуску з горкі складае 11 метраў, і імчыш ты ўніз больш як трыста метраў.

Нельга не адзначыць і старанне групы маладых людзей з розных гарадоў Гомельшчыны, аматараў графікі-малявання. У два этапы яны афармілі бакавыя сцены гаражнага кааператыва, якія выглядалі шэрымі і сумнымі, прыгожымі малюнкамі такіх славутасцяў горада, як капліца Ефрасінні Полацкай, Свята-Успенскі сабор, касцёл Святой Тройцы і г.д. Гэтыя малюнкі з боку ўезду з Гомеля склалі 115 метраў, а з боку ўезду з Мінска — 138 метраў, толькі апошнія паказваюць ужо маляўнічыя куткі беларускай прыроды. З'явіліся таксама выдатныя месцы для адпачынку людзей не толькі ў горадзе, але і за яго межамі, у наваколлях Дняпра і Ведрыча.

20 верасня адбыўся заезд у Рэчыцу творчых калектываў з розных абласцей рэспублікі, і вечарам у гаспадарках раёна былі арганізаваны канцэрты. Сёння ж адбылося ўрачыстае адкрыццё рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2007», ушанаванне ўладальнікаў другіх—трэціх месцаў у спаборніцтве на жніве і нарыхтоўцы кармоў, вялікая забаўляльная праграма. Але аб гэтым — у наступным нумары газеты.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

# На правядзенне рэспубліканскага спаборніцтва працаўнікоў вёскі выдзелена Br8 млрд

**Для ўзнагароджання пераможцаў рэспубліканскага спаборніцтва за дасягненне высокіх паказчыкаў на ўборцы збожжа і нарыхтоўцы кармоў у гэтым годзе зацверджана 386 ганаровых дыпломаў з грашовымі прэміямі і каштоўнымі падарункамі, у тым ліку ўдзельнікам жніва будзе ўручана 277 ганаровых дыпломаў.**

Для пераможца сярод абласцей заснаваны 1 ганаровы дыплом з грашовай прэміяй у суме Br50 млн. Сярод раёнаў — 6 ганаровых дыпломаў з грашовымі прэміямі па Br30 млн кожная. Для ўзнагароджання пераможцаў сярод сельгаспрадпрыемстваў устаноўлена 18 ганаровых дыпломаў з грашовымі прэміямі. Так, прэмія за першае месца складзе Br20 млн, за другое — Br15 млн, за трэцяе — Br10 млн.

Пераможцаў спаборніцтва сярод галоўных аграномаў у аглядзе-конкурсе павышэння культуры земляробства чакаюць 12 ганаровых дыпломаў з прэміямі ў суме Br5 млн кожная. У такім самым памеры будзе ўпершыню заахвочана праца лепшых галоўных інжынераў сельскагаспадарчых арганізацый.

Асаблівую цікавасць заўсёды выклікае спаборніцтва механізатараў. Для старшых камбайнераў механізаваных збожжаўборачных атрадаў, створаных пры арганізацыях, якія абслугоўваюць сельскую гаспадарку, заснавана 6 ганаровых дыпломаў і каштоўныя прызы (аўтамабіль — за першае месца, халадзільнік — за другое, маразільнік — за трэцяе). Пераможца сярод механізатараў, які займаў раней першае месца ў такім спаборніцтве, будзе ўзнагароджаны ганаровым дыпломам, камп'ютарам і грашовай прэміяй Br9 млн.

Лепшых памочнікаў камбайнераў мехатрадаў, створаных пры арганізацыях, якія абслугоўваюць сельскую гаспадарку, чакаюць 6 ганаровых дыпломаў і каштоўныя падарункі (камп'ютар — за першае месца, газавая пліта — за другое, тэлевізар — за трэцяе).

Пераможцы спаборніцтва сярод старшых камбайнераў сельгасарганізацый, акрамя ганаровых дыпломаў, за першае месца атрымаюць легкавы аўтамабіль, за другое — халадзільнік, за трэцяе — маразільнік.

Распрацаваны ўмовы спаборніцтва па нарыхтоўцы кармоў. Пераможца сярод абласцей атрымае ганаровы дыплом і прэмію ў памеры Br50 млн, сярод раёнаў — заснавана 6 ганаровых дыпломаў з грашовымі прэміямі па Br30 млн кожная, сярод сельгасарганізацый — 18 дыпломаў з грашовымі прэміямі ў залежнасці ад занятага месца (за першае — Br20 млн, за другое — Br15 млн, за трэцяе — Br10 млн). Прадугледжаны ўзнагароды для старшых камбайнераў кормаўборачных атрадаў і іх памочнікаў, а таксама вадзіцеляў, занятых на перавозцы кармоў.

Акрамя сродкаў з рэспубліканскага бюджэту падтрымкі сельгасвытворцаў, каштоўныя прызы для заахвочвання пераможцаў спаборніцтва выдзяляюць таксама прамысловыя прадпрыемствы і спонсары.

**Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.**

# Першае месца ў рэспубліканскім спаборніцтве на ўборцы ўраджаю заняла Мінская вобласць

**Калегія Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання сумесна з Рэспубліканскім камітэтам Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу і аблвыканкамамі падвяла вынікі рэспубліканскага спаборніцтва за дасягненне высокіх паказчыкаў ураджаю збожжавых і зернебабовых культур і нарыхтоўцы кармоў у 2007 годзе.**

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, на першае месца сярод абласцей у рэспубліканскім спаборніцтве на ўборцы ўраджаю ў гэтым годзе выйшла Мінская. Валавы збор збожжа ва ўсіх катэгорыях гаспадарак сталічнай вобласці склаў 1 млн 979 тыс. тон, што на 22 працэнты больш, чым у мінулым годзе. У гэтым годзе Мінская вобласць атрымала амаль адну трэць збожжа ад сабранага ўраджаю ў Беларусі.

Сярод раёнаў пераможцамі рэспубліканскага спаборніцтва на ўборцы збожжавых прызнаны: Баранавіцкі і Брэсцкі раёны Брэсцкай вобласці, Аршанскі і Віцебскі раёны Віцебскай вобласці, Веткаўскі і Рэчыцкі Гомельскай вобласці, Астравецкі і Гродзенскі Гродзенскай вобласці, Клецкі і Мінскі раёны Мінскай вобласці, Крычаўскі і Магілёўскі раёны Магілёўскай вобласці.

Брэсцкі, Віцебскі, Рэчыцкі, Гродзенскі, Мінскі і Магілёўскі раёны ўдастоены першага месца ў рэспубліканскім спаборніцтве паўторна.

Сярод сельскагаспадарчых арганізацый лепшымі названы ЗАТ «Белавежскі» Камянецкага раёна і РУСГП «Птушкафабрыка «Дружба» Баранавіцкага раёна, РУСП «Агракамбінат «Юбілейны» Аршанскага раёна, СВК «Крыўск» Буда-Кашалёўскага раёна, СВК «Кастрычнік-Гродна» Гродзенскага раёна, Філіял «Пяцігор'е» ААТ «Агракамбінат» Дзяржынскі», СВК «Агракамбінат «Сноў» Нясвіжскага раёна, СВК «Кастрычнік» Мсціслаўскага раёна, ЗАТ «Агракамбінат «Зара» Магілёўскага раёна. Прычым тры калектывы — птушкафабрыка «Дружба», агракамбінаты «Сноў» і «Зара» — вылучаны на ўзнагароджанне паўторна.

Вызначаны пераможцы спаборніцтва (па аднаму ад вобласці) сярод старшых камбайнераў сельскагаспадарчых арганізацый і механізаваных атрадаў, у тым ліку сярод маладзёжных экіпажаў, галоўных аграномаў. Так, сярод занятых першае месца — старшыя камбайнеры Уладзімір Ганчароў (СВК «Крошын» Баранавіцкага раёна), Міхаіл Паляшчук (ААТ «Брэсцкі райаграсэрвіс», стаў пераможцам другі раз), Аляксандр Грань (СВК «Калгас «Чырвоны сцяг» Рэчыцкага раёна), Леанід Дарашкевіч (СВК «Авангард-Агра» Навагрудскага раёна), Міхаіл Саладуха (Мінскае раённае ўнітарнае прадпрыемства «Агракамбінат «Ждановічы» Мінскага раёна), Сяргей Дзям'янаў (ЗАТ «Амкадор-Шклоў» Шклоўскага раёна).

Ганаровыя дыпломы, грашовыя прэміі і каштоўныя прызы пераможцам спаборніцтва будуць уручаны на рэспубліканскім фестывалі-кірмашы працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2007» у Рэчыцы (Гомельская вобласць).

**Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.**

**Открытое акционерное общество «ДСТ № 2, г. Гомель» сообщает**

**О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ,**

**которое состоится 1 октября 2007 года по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 28, 4-й этаж, конференц-зал.**

*Повестка дня:*

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель».
2. О внесении изменений в Устав Общества.
3. Об оказании благотворительной помощи.

**Начало собрания в 10.00.**

*Регистрация акционеров, их представителей с 9.00.*

С собой иметь документ, удостоверяющий личность акционера, представителям — доверенность.

# Аб'ём уводу жылля перавысіў 2,7 млн кв.м

**У Беларусі за кошт усіх крыніц фінансавання ў студзені—жніўні 2007 года ўведзена ў эксплуатацыю 2,716 млн кв.м жылля. Гэта на 11,6 працэнта перавышае ўзровень аналагічнага перыяду мінулага года і складае 57,8 працэнта гадавога задання, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу.**

Для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, за восем месяцаў уведзена 1,548 млн кв.м жылля, у тым ліку ў шматкватэрных жылых дамах у гарадах — 837,5 тыс. кв.м. Удзельная вага жылля, пабудаванага для гэтай катэгорыі грамадзян, склала 57 працэнтаў ад агульнага аб'ёму яго ўводу пры заданні 71 працэнт, адзначылі ў Мінстаце.

У сельскіх населеных пунктах і малых гарадскіх паселішчах у студзені—жніўні ўведзена 1,52 млн кв.м жылля, або 82,4 працэнта гадавога задання, у тым ліку ў сельскіх населеных пунктах — 962 тыс. кв.м жылля (35,4 працэнта агульнага ўводу па рэспубліцы).

За кошт уласных сродкаў насельніцтва ў студзені—жніўні гэтага года было пабудавана 1,451 млн кв.м жылля (на 8,7 працэнта больш, чым за аналагічны перыяд 2006 года), крэдытаў банкаў — 1,073 млн кв.м (на 18,7 працэнта больш), бюджэтных сродкаў — 90 тыс. кв.м (на 8,4 працэнта менш), уласных сродкаў арганізацый — 85 тыс. кв.м (на 11,3 працэнта менш).

За кошт сродкаў, прадугледжаных на пераадоленне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, у студзені—жніўні 2007 года пабудавана 110 кватэр агульнай плошчай 5,5 тыс. кв.м — адпаведна 53,1 працэнта і 52,4 працэнта да задання на год.

**Наталля ВЯРБІЦКАЯ, БЕЛТА.**

# Кітай: месяцавы спадарожнік

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая ў Беларусі У Хунбінь напярэдадні Нацыянальнага свята Кітайскай Народнай Рэспублікі, якое мае адбыцца 1 кастрычніка, сустрэўся з журналістамі, каб, як выказаўся спадар пасол, падзяліцца сваім святочным настроем з імі.**

Ужо 30 гадоў Кітай ідзе па шляху рэформаў і прапагандуе палітыку адкрытасці, што не магло не адбіцца на эканоміцы — краіна займае 4-е месца па аб'ёму ВУП у свеце пасля ЗША, Японіі і Германіі. На пазіцыю вышэй стаіць Кітай у рэйтынгу па аб'ёму гандлю.

З тых часоў, калі пачалася палітыка адкрытасці, Кітаем было выкарыстана каля 740 мільярдаў замежных інвестыцый. Нядзіўна, што Кітайская Народная Рэспубліка лідзіруе сярод краін, найбольш прывабных для інвестараў. Як вынік, 58 працэнтаў кітайскага экспарту складае прадукцыя прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі. Пры гэтым Кітай і сам актыўна інвестуе іншыя краіны: толькі за мінулы год было выдаткавана каля 21 мільярда долараў.

Паводле слоў спадара пасла, надзвычай імкліва развіваецца ў Кітаі навукова-тэхнічная галіна:

— Напрыканцы года плануецца запуск нашага першага месяцавага спадарожніка.

Спадар У Хунбінь падзяліўся сакрэтам імклівага развіцця кітайскай эканомікі: разумнае спалучэнне рэформаў і традыцый — развіццё з захаваннем стабільнасці. Кітай па-ранейшаму не мае намеру праводзіць палітыку прыватызацыі: грамадская форма ўласнасці першынствуе ў эканоміцы. Не менш важны прынцып сацыяльнай справядлівасці — распаўсюджванне матэрыяльных даброт на ўсе слаі насельніцтва.

— Кітай зараз знаходзіцца на пачатковай стадыі развіцця сацыялізму, — падкрэсліў спадар У Хунбінь.

Пасол згадаў таксама і пра некаторыя праблемы, што стаяць перад краінай: дысбаланс між усходняй (больш развітай) і заходняй часткамі Кітая, велізарныя энергетычныя затраты, праблемы з уладкаваннем на працу, вучобу з-за вялікай колькасці насельніцтва, а таксама цяжкасці ў забеспячэнні жыхароў Кітая жыллём, медыцынскім абслугоўваннем.

Налета ў Пекіне пройдуць Алімпійскія гульні, якім чынам ідзе падрыхтоўка?

— На сёння ўзведзены 37 галоўных спартыўных аб'ектаў, — кажа спадар пасол. — Пры іх будаўніцтве былі выкарыстаны найноўшыя тэхналогіі (у тым ліку энергазберагальныя) і матэрыялы.

Каб палегчыць камунікацыю з гасцямі краіны, жыхары Пекіна пачалі актыўна і масава вывучаць англійскую мову.

— Беларусь для Кітая — шчыры і надзейны партнёр, — адзначыў спадар У Хунбінь. — Нашы ўзаемаадносіны развіваюцца на аснове роўнасці, даверу і ўзаемных выгод. Кітай гатовы павялічыць інвестыцыі ў беларускую вытворчасць: цэментны завод, фабрыка па вытворчасці ДСП. Банк развіцця Кітая плануе адкрыць сваё прадстаўніцтва ў Мінску. З іншага боку, такія буйныя беларускія прадпрыемствы, як БелАЗ, Гомсельмаш, МТЗ маюць трывалыя пазіцыі на кітайскім рынку. У гуманітарнай сферы мы таксама актыўна супрацоўнічаем: звыш тысячы кітайскіх студэнтаў атрымліваюць адукацыю ў Беларусі.

**Ала МАЧАЛАВА.**

# Беларусь і Маскоўская вобласць

## павялічаць тавараабарот да 2-х мільярдаў долараў

**У Магілёве адбылося сумеснае пасяджэнне Рабочай групы па развіццю і каардынацыі супрацоўніцтва Беларусі і Маскоўскай вобласці.**

Дэлегацыю расіян узначальваў намеснік старшыні Урада Маскоўскай вобласці Васіль Громаў. Беларускую частку рабочай групы прадстаўляў намеснік прэм'ер-міністра Андрэй Кабякоў.

У першым паўгоддзі тавараабарот Беларусі і Маскоўскай вобласці перавысіў мільярд долараў.

— Гэта вельмі сур'ёзны паказчык, — зазначыў Андрэй Кабякоў. — Сюды не ўваходзіць нафта і газ, гэта толькі тавары. І гэта лічба супастаўная з аб'ёмам тавараабароту, напрыклад, з Украінай, якая непараўнальна большая па колькасці насельніцтва за Маскоўскую вобласць.

— З беларусамі мы гандлюем столькі ж, колькі з усімі іншымі постсавецкімі краінамі разам, — падтрымаў Васіль Громаў. — Таму Беларусь — наш буйны партнёр. І лічбу тавараабароту нам трэба давесці як мінімум да двух мільярдаў долараў.

Для таго, каб такія планы спраўдзіліся, і праводзяцца пасяджэнні Рабочай групы. У Магілёве галоўная ўвага была нададзена сферы прамысловасці і стварэнню ў Маскоўскай вобласці сэрвісна-гандлёвых цэнтраў беларускіх прадпрыемстваў.

Мінскі аўтамабільны завод супрацоўнічае з прадпрыемствамі Маскоўскай вобласці ў выпуску спецыяльных машын. На базе беларускага шасі ў Падмаскоўі наладжаны выпуск камунальнай тэхнікі, і МАЗ спадзяецца на пашырэнне гэтага праекта. Мяркуецца, што завод пабудуе ў Маскоўскай вобласці таксама і сэрвісны цэнтр.

У двух падмаскоўных раёнах павінны з'явіцца беларускія гандлёва-лагістычныя цэнтры. Зямельны ўчастак для аднаго з іх, у Раменскім раёне, беларускі бок днямі выкупіў на аўкцыёне.

«Бабруйскаграмаш» разглядае праект стварэння сумеснай з расіянамі вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі. А адно з маскоўскіх прадпрыемстваў прапанавала набыць энергазберагальнае абсталяванне, якое дазволіць зрабіць беларускую прадукцыю больш таннай, а таму — больш канкурэнтаздольнай.

Беларускія сельгасвытворцы зацікаўлены прадаваць у Падмаскоўі яйкі, мясныя і малочныя прадукты і набываць у расіян хімічныя сродкі абароны раслін і тэхніку.

Беларускія педагогі цікавяцца вопытам стварэння школ поўнага дня (гэта дарэчы для нашых аграгарадкоў), а іх калегі з Маскоўскай вобласці — арганізацыяй працоўнага навучання дзяцей-інвалідаў.

У наступным годзе ў Мінску плануецца правесці выставу Дзяржаўнага дома-музея Пятра Чайкоўскага, а беларускія творчыя калектывы ўжо цяпер запрошаныя на святочныя мерапрыемствы да 65-годдзя Перамогі, якія адбудуцца ў Маскоўскай вобласці ў 2010 годзе.

Актыўна развіваюцца пабрацімскія сувязі. Выстава-кірмаш магілёўскіх тавараў прайшла ў падмаскоўным Звянігарадзе, а ў Нара-Фамінску з'явіліся Бабруйскі сквер (з бабром на лаве) і Бабруйская вуліца.

**Ілона ІВАНОВА.**

**Актуальна**

# УЗНАГАРОДА ІМЯ МАСТАЦТВА

Днямі сталі вядомыя намінанты прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2007—2008 гады. Першапачаткова на атрыманне прэміі ад абедзвюх краін было прадстаўлена 30 кандыдатур, да фіналу камісія адабрала 6 прэтэндэнтаў. У спісе пераможцаў, набраўшы неабходныя тры чвэрці галасоў экспертаў, — народныя артысты Беларусі Міхаіл Фінберг і Уладзімір Гасцюхін і народны артыст Расіі рэжысёр Сяргей Арцыбашаў. Само ўручэнне прэмій адбудзецца ў наступным годзе на цырымоніі адкрыцця Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

«Я ніколі не думаў спецыяльна аб гэтай прэміі, проста ўсё жыццё працаваў сур'ёзна і адказна. Проста так атрымалася, што ўся творчая дзейнасць была звязаная і з Расіяй, і з Беларуссю. Я ўвогуле не ўспрымаю гэтыя краіны адасобленa: наша музычная школа, хоць і мае свае адметныя рысы, але вучыліся мы яшчэ па тых, савецкіх падручніках», — сцвярджае на сустрэчы з журналістамі Міхаіл Фінберг. Але па ўсім відаць — такой высокай ацэнкай сваёй дзейнасці ганарыцца. Дарэчы, на прэмію дырэктар і мастацкі кіраўнік Нацыянальнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Беларусі быў вылучаны за серыю канцэртных праграм, прысвечаных творчасці беларускіх і расійскіх кампазітараў: Яўгена Глебава, Аляксандра Зацэпіна, Максіма Дунаеўскага, Давіда Тухманава, Уладзіміра Мулявіна, Марка Фрадкіна, Аляксандры Пахмутавай.

Надалей традыцыя захавання, перапрацоўкі і паказу шырокай публіцы музычнай спадчыны Беларусі і Расіі будзе працягвацца. У хуткім часе намаганнямі кіраўніка аркестра ў Беларусі з'явіцца новы фестываль — «Песні (шлягеры), якія мы любілі ў СССР». Ужо ў кастрычніку—лістападзе ў Мінску пройдзе першая праграма фестывалю, складзеная з твораў Мікаэла Тарывердзіева. Наступныя праграмы будуць прысвечаныя Оскару Фельцману, Ціхану Хрэннікаву, Андрэю Пятрову і Марку Фрадкіну, Яну Фрэнкелю і Юрыю Мілюціну, а таксама ансамблю «The Beatles». Гэта пры тым, заўважым, што аркестр і без таго выступае заснавальнікам 10 розных фестываляў, якія ладзяцца ў малых гарадах — на сёння такіх фестываляў адбылося больш за 70.

Яшчэ адна важная з'ява наступнага года — праграма «Музыка беларускага кіно», у якую ўвайшлі самыя розныя творы, пачынаючы з 1934 года, уключаючы ў тым ліку знакамітыя дзіцячыя казкі, знятыя на «Беларусьфільме».

Гэтаксама ўжо ідзе праца над тэматычным канцэртам, прысвечаным 80-годдзю кампазітара Ігара Лучанка (гэты юбілей будзе адзначацца ў верасні 2008 года), рэпетуецца праграма твораў кампазітара Уладзіміра Будніка, рыхтуецца праграма да 105-годдзя з дня нараджэння паэта Адама Русака. «Каб усё гэта рэалізаваць, трэба мець вельмі прафесійны калектыў, аднадумцаў, якія падтрымліваюць цябе і разумеюць, што трэба рабіць зараз і куды рухацца ў перспектыве», — адзначае Міхаіл Фінберг. А вось ролю дырыжора ён, наадварот, бачыць вельмі сціплай — «мастацтва дырыжора ў тым, каб не вылучыць сябе, а правільна скласці драматургію канцэрта, даць магчымасць усім музыкантам праявіць сябе». Такая магчымасць, дарэчы, у музыкантаў выпадзе і сёння — падчас рэспубліканскага фестывалю «Дажынкі-2007». А 28—29 верасня ў Мсціславе па традыцыі пройдзе Рэспубліканскі фестываль камернай музыкі імя М. Чуркіна — сёлета ён таксама поўны сюрпрызаў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# «ЖЫХАРЫ ВЯРТАЮЦЬ ...»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Як адзначыў Сяргей Сушко, сацыяльнымі стандартамі прадугледжана такая магчымасць. Праўда, у вялікіх гарадах (тым жа Мінску) звяртацца да такой меры не плануецца. Паводле слоў намесніка міністра ЖКГ, да канца года мяркуецца абсталяваць лічыльнікамі спажывання вады 971 тысячу кватэр. Павялічваецца колькасць брыгад, якія займаюцца ўстаноўкай гэтых прыбораў. Жыхары зацікаўлены абсталёўваць кватэры лічыльнікамі вады, паколькі ў такім разе на працягу некалькіх наступных гадоў дзейнічае 20-працэнтная скідка з адпаведных плацяжоў. Аб тым, каб уводзіць больш высокія тарыфы для жылля, дзе няма прыбораў уліку, гаворкі пакуль не вядзецца.

Як зазначыў Сяргей Сушко, планавалася, што сёлета ўзровень пакрыцця насельніцтвам затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг павінен скласці 41 працэнт. Фактычна цяпер гэты паказчык складае 34 працэнты. Відавочна, што наспела неабходнасць у павышэнні тарыфаў, прычым, адзначаюць пэўныя крыніцы, павелічэнне плацяжоў за кватэру можа адбыцца ўжо з 1 кастрычніка. Аднак Сяргей Сушко пакінуў пытанне адкрытым, спаслаўшыся на тое, што гэта кампетэнцыя Міністэрства эканомікі. Рашэнне аб памерах павелічэння тарыфаў на наступны год будзе прынятае да 1 снежня. Як заўважыў спецыяліст, рэзкага павышэння плацяжоў чакаць не варта, паколькі ў такім разе ўзрастуць даўгі насельніцтва. Ужо зараз пратэрмінаваная запазычанасць жыхароў па аплаце за кватэру складае каля 40 мільярдаў рублёў (з іх 7 млрд руб. — па Мінску).

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

**Завітайце ў новы музей!**

# ВЫРАТАВАНЫЯ РЭЛІКВІІ РАДУЮЦЬ ВОКА

## Мытнікі дасталі са сваіх «запаснікоў» канфіскаваныя ў кантрабандыстаў культурныя каштоўнасці

**Выдатны падарунак у дзень свайго прафесійнага свята зрабілі самім сабе і ўсяму народу беларускія мытнікі. Учора адбылося адкрыццё першай экспазіцыі Цэнтральнага музея гісторыі мытнай службы нашай краіны.**

Увазе наведвальнікаў былі прадстаўлены культурныя каштоўнасці, канфіскаваныя мытнікамі за апошнія 10 гадоў у кантрабандыстаў. Большасць экспанатаў выставы складаюць рускія праваслаўныя абразы XVIII—XX стагоддзяў. Як адзначыў падчас адкрыцця экспазіцыі старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта (ДМК) Аляксандр Шпілеўскі, гэта толькі тысячная доля выратаваных мытнікамі рэліквій. Паводле яго слоў, толькі у Брэсцкім краязнаўчым музеі больш за 4 тысячы каштоўных прадметаў, якія былі канфіскаваны мытнікамі ў кантрабандыстаў, у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі 664 такія рэліквіі. Але і гэта яшчэ не ўсё. Зараз у «мытных запасніках» знаходзіцца некалькі тысяч рарытэтаў. Адных толькі абразоў прыкладна 500. Больш за тое, паводле слоў Аляксандра Шпілеўскага, «мытная калекцыя» абразоў пастаянна папаўняецца. Кожны тыдзень мытнікі затрымліваюць у сярэднім 17 абразоў, якія кантрабандысты спрабуюць вывезці за межы Беларусі, у асноўным цераз мяжу з Польшчай. Пэўная частка гэтых каштоўнасцяў перадаецца праваслаўнай царкве. Праўда, як паведаміў адзін з арганізатараў мытнага музея, галоўны інспектар вучэбнага цэнтра Мінскай цэнтральнай мытні Віктар Астрогаў, вялікая колькасць абразоў царквой не запатрабаваная, бо гэтыя рэліквіі не падыходзяць для аздаблення храмаў, яны былі створаны для прыватных асобаў і знаходзілася ў жылых памяшканнях. Аднак было б несправядліва, калі б такія рэліквіі захоўваліся ў «мытных запасніках». Таму ДМК сумесна з Нацыянальным мастацкім музеем плануе ў бліжэйшыя два месяцы стварыць паўнавартасны Цэнтральны музей гісторыі мытнай службы. У ім, паводле слоў Аляксандра Шпілеўскага, будзе сабрана значная частка нашага культурнага нацыянальнага набытку. Дарэчы, адначасова з адкрыццём экспазіцыі адбылася прэзентацыя кнігі па гісторыі мытнай службы нашай краіны.

Што датычыць першай экспазіцыі, то, хоць яна і не сакрэтная, фармальна адкрытая для ўсіх, але рэальна яе наведаць можна толькі ў складзе групы. Бо сам музей знаходзіцца ў памяшканні мытні (на вуліцы Магілёўскай, 45/3), куды няма вольнага доступу. Каб трапіць у музей, неабходна загадзя дамовіцца з мытнікамі, якія і арганізуюць экскурсію.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# СІБІРСКІ ЗАКАЗ

**Раніцай прахадная маладзечанскага завода «Унікаб-Амкадор» часам нагадвае тэхнічны коледж — шмат маладых спецыялістаў і рабочых, у нядаўнім мінулым выпускнікоў вучылішчаў, спяшаюцца на свае працоўныя месцы.**

Сёння эканамічная сітуацыя на прадпрыемстве даволі аптымістычная: завод працуе ў тры змены, пастаянна растуць аб'ёмы вытворчасці, павышаецца і зарплата, поўны партфель заказаў. Апошняе — сфера асаблівых клопатаў кіраўніцтва прадпрыемства, якое стаўку робіць на маладыя кадры. Менавіта ім давяраецца работа на адказных участках вытворчасці. Сёння гэта, паводле слоў дырэктара прадпрыемства Аляксандра Ліса, выкананне так званага сібірскага заказу.

Завод спецыялізуецца на выпуску ўніверсальных кабін (Унікаб — універсальная кабіна) для сучаснай будаўніча-дарожнай тэхнікі. Яе ў значных аб'ёмах вырабляе мінскае прадпрыемства «Амкадор». Адсюль і двайная назва завода. Як і паўсюдна яго калектыў літаральна змагаецца за якасць, а значыць і канкурэнтаздольнасць сваёй прадукцыі. Як і большасць беларускіх прадпрыемстваў завод імкнецца пашырыць геаграфію паставак, замацавацца на замежных рынках. Для «Унікаб-Амкадора», напрыклад, у сілу былых цесных кааперацыйных і вытворчых сувязяў, перспектыўнымі з'яўляюцца рэгіёны Расійскай Федэрацыі. Там апошнім часам назіраецца ажыўленне прадпрыемстваў машынабудаўнічага комплексу. Некалькі гадоў таму «Унікаб-Амкадор» наладзіў на выгадных умовах пастаўкі сваіх кабін у горад Ціхвін Ленінградскай вобласці.

Цяпер прадукцыяй маладзечанцаў ужо зацікавіліся ў Сібіры, дакладней, на буйным заводзе «Омск-трактар». Там зараз актыўна ідзе працэс аднаўлення вытворчасці, пачалося пашырэнне а'ёмаў выпуску тэхнікі для сібірскіх губерній. Вось жыхары Омска і зацікавіліся маладзечанскімі кабінамі, якія яны аднойчы ўбачылі на магутных «Кіраўцах» на адной прамысловай выстаўцы ў Маскве. Прадстаўнікам «Омск- трактара» спадабалася сучасная па дызайну і вельмі камфартабельная ў параўнанні з пэўнымі расійскімі аналагамі кабіна з Маладзечна. Яна зручная для кіравання трактарам, мае выдатны агляд, два камфортныя сядзенні, радыё, ацяпляльнае абсталяванне, па жаданню спажыўца можна ўсталяваць кандыцыянер. Вядома, увагу сібіракоў у значнай ступені прыцягнулі суадносіны цаны і якасці кабіны, якая, акрамя гэтага, адпавядае еўрапейскім стандартам.

Вось омічы і вырашылі «навесці масты» з «Унікаб-Амкадорам». Спачатку яны правялі выпрабаванне іх кабіны ў экстрэмальных умовах: на апракідванне і бакавыя ўдары, пратэсціравалі і па іншых пазіцыях. І толькі потым прыйшлі да высновы: падыходзіць.

Цяпер, як гаворыць Аляксандр Францавіч, задача заводскіх інжынераў і рабочых, у тым ліку і маладзі, забяспечыць якасны выраб кабін для сібіракоў. Бо з часам «Омск-трактар» абяцае стаць выгадным партнёрам.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

*НА ЗДЫМКУ: слесары механазборачных работ **Іван КАБЫШ** і **Аляксандр АТРОШЧЫК** на завяршальным этапе выпуску новай кабіны.*

### У МІНСКУ РАСПРАЦОЎВАЕЦЦА НОВАЯ СХЕМА РУХУ ТРАНСПАРТУ Ў ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЧАСТЦЫ ГОРАДА

**У Мінску ў гэтым годзе пачата распрацоўка комплекснай схемы арганізацыі руху, накіраванай на паляпшэнне руху транспарту і пешаходаў у цэнтральнай частцы горада.**

Аб гэтым паведаміў начальнік аддзялення арганізацыі дарожнага руху ўпраўлення ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Яўген Каспіровіч на прэс-канферэнцыі ў мэрыі.

Паводле яго слоў, у новай схеме будзе прадугледжана будаўніцтва парковак, паляпшэнне руху грамадскага транспарту, развіццё вулічна-дарожнай сеткі, а таксама ўдасканаленне кіравання транспартнымі патокамі пры дапамозе святлафораў. Распрацоўка такога дакумента будзе завершана ў 2007—2008 гадах.

Разам з тым, як адзначыла начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды ўпраўлення ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Жанна Трайно, у Мінску ў параўнанні з Масквой сітуацыя з заторамі на дарогах не настолькі вострая. «Калі вадзіцель не праехаў святлафор за 3 цыклы, гэта яшчэ не заторная сітуацыя», — лічыць спецыяліст.

**БЕЛТА.**

### ПАСОЛЬСТВА ВЯЛІКАБРЫТАНІІ Ў БЕЛАРУСІ З 27 ВЕРАСНЯ ЎВОДЗІЦЬ БІЯМЕТРЫЧНЫЯ ВІЗЫ

**Як растлумачылі карэспандэнту БЕЛТА ў дыпламатычнай місіі Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў Мінску, з 27 верасня ўсе жадаючыя выехаць у Вялікабрытанію незалежна ад нацыянальнасці для афармлення заявы на візу павінны будуць асабіста прысутнічаць пры падачы дакументаў у пасольстве для зняцця электронных адпечаткаў пальцаў і лічбавага фатаграфавання.**

«Адпячаткі пальцаў будуць здымацца электронным сканерам. Пры гэтым не будуць выкарыстоўвацца якія-небудзь вадкасці, чарніла або хімічныя рэчывы. Пасля гэтага будзе зроблена лічбавая фатаграфія. Увесь працэс зойме не больш як пяць хвілін. Гэта новаўвядзенне не паўплывае на бягучы кошт віз», — паведамілі ў дыппрадстаўніцтве.

Згублены **атэстат аб сярэдняй адукацыі**, выдадзены ў 2001 годзе гімназіяй № 1 г. Ліды Гомельскай вобласці на імя **Кесо Ілоны Пятроўны,** лічыць **несапраўдным**.

## Крымінал, здарэнні

### РЫБКІ МОЦНА ЗАХАЦЕЛАСЯ...

**Работнікамі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь за крадзеж рыбы ў сажалках рыбгаса «Сялец» былі затрыманы два рыбаводы гэтага ж прадпрыемства.**

Канфіскавана 34 кілаграмы рыбы. Паколькі гэта паўторнае падобнае парушэнне работнікаў, здзейсненае імі на працягу года, складзеныя ў іх дачыненні адміністрацыйныя пратаколы накіраваны ў суд Бярозаўскага раёна. Супрацоўнікамі Мазырскай міжрайінспекцыі каля апоўначы на беразе Прыпяці ў Нараўлянскім раёне быў знойдзены пусты аўтамабіль УАЗ. Была арганізавана засада. А палове пятай раніцы побач да берага прысталі дзве маторныя лодкі. Пры затрыманні адна лодка з двума невядомымі знікла, у другой жа аказаліся вартаўнік СВК «Чырвоны баец» і вадзіцель жыллёва-камунальнага прадпрыемства з Нароўлі. У іх было канфіскавана 575 метраў сетак і рыба агульнай вагой 92 кілаграмы, якая была здадзена ў гандлёвую сетку. Паколькі прыродным рэсурсам нанесены ўрон у асабліва буйным памеры (111 базавых велічынь), матэрыялы для разгляду перададзены ў пракуратуру Нараўлянскага раёна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ЯЗЫК ДА «ХІМІІ» ДАВЁЎ

**Беларускія пракуроры і суддзі не любяць, калі іх падманваюць.**

Паводле звестак Генеральнай пракуратуры, за 8 месяцаў гэтага года ў нашай краіне зарэгістравана 288 крымінальных спраў, узбуджаных па фактах наўмысна лжывых паказанняў сведкаў. Многія такія асобы ўжо пакараны судом. Так, напрыклад, пракуратура Цэнтральнага раёна Гомеля вывела на чыстую ваду двух махляроў, якія, каб дапамагчы абвінавачваным пазбегнуць пакарання за ўчыненыя злачынствы, давалі лжывыя паказанні ў судзе. Слугі Феміды прыгаварылі кожнага з падманшчыкаў да 1 года папраўчых работ (гэты від пакарання яшчэ з савецкіх часоў у народзе называюць «хіміяй»). Адзін ілжэсведка будзе штомесяц выплачваць у даход дзяржавы 20 працэнтаў свайго заробку, другі — 10 працэнтаў.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### ПАЛІВА, ДЫ НЕ ТОЕ

**На працягу двух гадоў трое прайдзісветаў нажываліся на розніцы ў кошце дызельнага і пячнога паліва.**

Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, двое жыхароў Слуцка і мінчанін у 2005 і 2006 гадах пастаўлялі на адрас аднаго з нясвіжскіх прадпрыемстваў пячное паліва. Праўда, пад выглядам саляркі (што махляры пацвярджалі), выкарыстоўваючы несапраўдныя дакументы. У выніку іх махінацый прадпрыемству быў нанесены ўрон на суму не менш як 30 млн рублёў. Па факту ўзбуджана крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ВІЦЯБЧАНІН РАЗБОЙНІЧАЎ У ЧЭХІІ

**У Кастрычніцкі РАУС Віцебска паступілі матэрыялы з Чэхіі адносна беспрацоўнага 44-гадовага жыхара Віцебска.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, чэшскія паліцэйскія высветлілі, што ён у Празе на вуліцы пад пагрозай прымянення насілля завалодаў 900 доларамі ЗША, што належалі мінчаніну і яшчэ 200 чэшскіх крон адабраў у аднаго жыхара сталіцы Беларусі.

Устаноўлена, што ён жа прыкладна праз тыдзень, таксама ў Празе, пагражаючы нажом, «экспрапрыяваў» 600 еўра ў жыхара Адэсы, а ў яго земляка — 1300 чэшскіх крон. Узбуджана крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### КАНТРАБАНДНЫ СТАЛОВЫ АНТЫКВАРЫЯТ

**У пункце пропуску «Брэст—Цярэспаль» супрацоўнікі мытні «Заходні Буг» выявілі партыю антыкварнага сталовага посуду.**

Паводле звестак прэс-службы Дзяржаўнага мытнага камітэта, 137 найменняў сталовага посуду агульным коштам больш за 40 млн рублёў спрабаваў незаконна ўвезці ў Беларусь вадзіцель аўтобуса, які вёз пасажыраў з Германіі. Лёс сталовага антыкварыяту вырашыць суд.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### ДЗВЕ АВАРЫІ — ТРОЕ ЗАГІНУЛЫХ...

**Трое чалавек загінулі і трое пацярпелі ў двух дарожна-транспартных здарэннях, што зафіксаваны ў Баранавічах і Клічаўскім раёне.**

У першым выпадку 23-гадовы жыхар вёскі Узногі, які знаходзіўся за рулём «БМВ», не справіўся з кіраваннем і аўтамабіль ударыўся ў асвятляльную мачту. Сутыкненне стала пагібельным для вадзіцеля і 27-гадовага пасажыра. Яшчэ адзін 25-гадовы мужчына, які знаходзіўся ў салоне аўто, змешчаны ў бальніцу.

У Клічаўскім раёне ДТЗ адбылося на дарозе паблізу вёскі Старыя Максімавічы, дзе ў кювеце апынулася і перакулілася машына «Фольксваген». У выніку гэтага здарэння загінуў 30-гадовы жыхар Клічава, а яго зямляк і жыхар вёскі Дзмітроўка былі змешчаны ў бальніцу.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ЛЮДЗІ ПАДАРВАЛІСЯ НА... РАСЦЯЖКАХ

**З панядзелка адшуквалі 54-гадовага жыхара вёскі Мармоль Жлобінскага раёна, які пайшоў на паляванне і не вярнуўся дадому: як высветлілася пазней, незвычайныя метады палявання мужчыны скончыліся трагедыяй.**

Усе акалічнасці гэтага здарэння «Звяздзе» паведаміў прэс-сакратар Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў. У прыватнасці, на наступны дзень пасля знікнення вяскоўца пошукамі заняўся яго 21-гадовы знаёмы. Ведаў малады вясковец і пра тое, якім чынам палюе за жывёлай зніклы: на сцежках дзікоў той ставіў расцяжкі — выбуховыя прыстасаванні, якія прыводзяцца ў дзеянне ад нацяжэння малазаўважнай ніці. У першы ж дзень пошукаў малады чалавек знайшоў веласіпед, на якім паляўнічы выехаў з дому. Праўда, яго самога нідзе не было. На наступны дзень юнак зноў працягваў самастойныя пошукі і знайшоў-такі мужчыну — апошні ляжаў на зямлі. Падбягаючы да яго, хлопец не заўважыў расцяжкі — прагучаў выбух. У выніку пацярпелы атрымаў асколачныя раненні абедзвюх ног, але, тым не менш, змог самастойна дабрацца да вёскі, перабінтаваўшы раны кашуляй. У бальніцы Жлобіна яго прааперыравалі, і зараз стан юнака не выклікае апасенняў. А палове шостай вечара сапёры, якія выехалі на месца здарэння, знайшлі цела паляўнічага, які загінуў ад шматлікіх асколачных раненняў і страты крыві. Зараз праводзіцца абследаванне і размініраванне мясцовасці, дзе цікаваў за жывёлай няшчасны вясковец.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### КРЫМІНАЛ У... КАБІНЕЦЕ ФЛЮАРАГРАФІІ

**Неверагодная гісторыя здарылася сярод дня ў кабінеце флюараграфіі звычайнай віцебскай паліклінікі: невядомы пырснуў з газавага балончыка ў твар 56-гадовай жанчыны — мясцовай жыхаркі.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, жанчына звярнулася па дапамогу ў Кастрычніцкі РАУС абласнога цэнтра. Устаноўлена, што хуліганіў такім чынам... намеснік дырэктара аднаго з прыватных прадпрыемстваў. Узбуджана крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# «ДЗВЯРЫМА НАСУПРАЦЬ МАГЛІ ЖЫЦЬ ТОЛЬКІ ВЕЛЬМІ ДОБРЫЯ І АДКРЫТЫЯ ЛЮДЗІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Пераможцамі ўсяго этапу сталі сем'і Герасімёнкаў і Сурвілаў, якія набралі па дзевяць галасоў. Першая сям'я — адзін з лідараў праекта, на яе рахунку ўжо тры пераможныя тытулы за першае месца, тры — за другое і тры — за трэцяе.


Пакуль мужчыны працуюць...

Мы вырашылі бліжэй пазнаёміцца і прадставіць чытачам сям'ю Герасімёнкаў. Патэлефанавалі яе главе Віктару і папрасілі расказаць пра сваіх блізкіх.

— Я працую на Полацкай дыстанцыі сігналізацыі і сувязі Беларускай чыгункі электрамеханікам. Мая жонка Маргарыта — заатэхнік у СВК «Ломашы-Агра». У нас двое дзетак: дачцэ Настассі 11 гадоў, сыну Яўгену — 13 гадоў. Як прайшоў этап «Хутарок»? Цікава было, вельмі весела, усё як след арганізавана, за што дзякуй нашым каардынатарам праекта. Самым незабыўным было, напэўна, як мы пайшлі ў Мосар у нацыянальных строях зарабляць харчаванне. Людзі ставіліся вельмі прыязна да нас, нехта даваў сала, хтосьці яек, у адной хаце пачаставалі дранікамі. Зрэшты, нехта з вяскоўцаў, мабыць, падумаў, што мы цыгане *(смяецца)*. Паглядзеўшы на нас, асабліва мужчын, сказалі, маўляў, ды вам працаваць трэба, а не жабраваць *(смяецца)*. Дзве бабулі ўвогуле напалохаліся, зачыніліся ў хаце. Запомнілася яшчэ, як без электрычнага святла, пры газавай лямпе гатавалі сабе ежу. Адносіны паміж сем'ямі былі цудоўнымі. Мы хаця і спаборнічалі, але гэта не перашкодзіла многім аддаць за нас свае галасы. Ды што тут казаць, сапраўды ўсё было вельмі цудоўна.


Сям'я ПАШКОВІЧАЎ.

— Усе мы вельмі задаволены этапам «Хутарок», — пацвярджае Марына Гараповіч. — Ведаеце, у гэтага хутара сапраўды аказалася нейкая адметная, вельмі добрая энергетыка. Там быў невялікі двор, а вакол яго — чатыры дамы, якія выходзілі адзін на адзін дзвярыма. Мы ўпэўнены, што вось так маглі жыць толькі вельмі добрыя і адкрытыя людзі.

Хто зараз найбольш верагодны лідар у праекце? Інтрыга пакуль захоўваецца, бо кожны этап можа змяніць сітуацыю. Скажам, на папярэднім тытул пераможцаў заваявала сям'я Пашковічаў: Анатоль з Аленай і трое іх дзетак (увогуле яны ўжо маюць таксама тры пераможныя тытулы за розныя конкурсы). Спаборніцтва па нарыхтоўцы дроў праходзілі ў СВК «Капыльшчына» (кіраўнік Сяргей Мікалаевіч Міхасёў) у аднайменнай вёсцы. Ігракі не проста спаборнічалі, а падчас этапу рэальна аказалі дапамогу адзінокай бабулі Валянціне Фёдараўне Раціялеўскай, чый муж не вярнуўся з фронту...

Наступным у апошнія дні верасня будзе кулінарны конкурс. Ён запланаваны на базе філіяла «Прошкава» ААТ «Глыбоцкі аграсэрвіс» (кіраўнік Мікалай Аляксандравіч Лаўцевіч). Сем'і будуць спаборнічаць у майстэрстве прыгатавання страў нацыянальнай беларускай кухні ў рускай печы. Ужо зараз тэрмінова вядуцца пошукі адзінаццаці гаспадынь, якія маюць у доме рускую печ і гатовы даць яе ў «карыстанне» будучым кулінарам.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота Марыны ГАРАПОВІЧ.**

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

# Доктар І-ГО-ГО

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

У Валянціны з Зёвам — поўнае ўзаемаразуменне:

— Запавет быў у мяне ўжо не першы год, калі я заўважыла, што ім вельмі лёгка ўпраўляць, ён выконваў усе каманды, повад быў ледзь не лішні — мне нават рукі не было куды падзець. Праз некаторы час пашылі спецыяльны капсуль, пры дапамозе якога можна было ездзіць без жалеза ў роце — па баках да капсуля былі прымацаваны кольцы, і повад чапляўся за іх. А потым я выпадкова прачытала артыкул Пата Парэлі пра натуральныя адносіны з коньмі, без пакаранняў і жорсткасці, і пачала эксперыментаваць са сваім Зёвам. Праз месяц аброць была не патрэбна яму нават тады, калі ён працаваў з хворымі.

Для ўсіх «дзяцей» (так ласкава яна іншым разам называе сваіх коней) Вінаградавай дастаткова голасу і дотыку.

— Прычым для каманды «адыдзі» Зёву не трэба нават на грудзі націскаць, толькі пацягнешся — ён сам адыходзіць.

## Салома на чатырох ножках

— Калі мы куплялі Дусю, яна была падазрона круглай, — успамінае Валянціна. — Пасля няўдалых родаў сваёй любімай кабылы я такіх баюся, аднак мяне супакоілі — гэта яна саломай так пуза раз'ела. У клетцы сапраўды шмат сена ляжала — мо і праўда, наеліся ўдосталь... так і купілі. А праз два месяцы прыйшлі карміць, а «салома» тая вакол нашай Дусі на чатырох ножках скача. Цёму мы з дзяцінства прывучвалі працаваць без аброці, ён нават не здагадваецца ні пра якія жалезкі ў роце. Матулі яго аднойчы паказалі, што можна і без гэтага ...і ведаеце, яна зразумела, што так лепш.

Ну, кабыла яшчэ сяк-так, а вось каб жарабец...

— Многія знаёмыя аматары коней аповеды пра Цёму ўспрымалі скептычна, — кажа Валянціна Аляксандраўна, — маўляў, як двухгадовы жарабец можа працаваць з дзецьмі-інвалідамі — такія маладыя коні, як правіла, амаль некіруемыя, з імі цяжка нават вопытнаму наезніку. Адзін знаёмы на слова не паверыў — прыехаў сюды, каб упэўніцца асабіста. Пабачыў, спачатку змоўчаў, а потым развёў рукамі і сказаў: «Колькі цябе ведаю, ты заўсёды была вар'яткай!».

## Звычайнае чараўніцтва

Нехта можа назваць Валянціну вар'яткай і тады, калі яна ставіць капыт любімага Запавета сабе на галаву — самы шыкоўны нумар, іншыя называюць гэта чараўніцтвам. А чараўніцтва ў коней Валянціны Вінаградавай хапае — не толькі з-за таго, што яны вылечваюць хворых дзяцей, але і з-за іх незвычайнай афарбоўкі.

— Цёмачка нарадзіўся абсалютна рыжым, была толькі белая адмецінка на крупе. Тады яшчэ я меркавала яго прадаваць. Год расціла, і зразумела аднойчы, што расстацца з ім не змагу. Праз колькі часу на ім з'явіліся так званыя Магаметавы плямы, ён стаў нібы леапардавы, прычым адбылося гэта зімой, калі лінькі не было, таму спіхнуць усё на яе не выпадала. Пра самі плямы ёсць цікавае паданне: Прарок Магамет быў уражаны прыгажосцю і адданасцю адной беласнежнай арабскай кабылы. У знак пашаны ён дакрануўся да цудоўнай жывёлы, і на тым месцы ўтварылася чорная пляма. З тых часоў чорныя плямы на конях лічацца знакам Боскага блаславення. Уладальнікі такіх коней ганарацца імі. Ва ўсіх трох маіх коней ёсць такія плямы, — не без гонару дадае Валянціна.

Сваімі коньмі яна жыве — гэтая 35-гадовая жанчына, за напускной прастатой і грубасцю якой хаваюцца чуллівасць і спагадлівасць. Яна можа з боем абараняць сваіх выхаванцаў і расплакацца ад падоранай дзяўчатамі акварэлі з выявай Запавета: «Ну, паганкі, гэта ж трэба такі сюрпрыз мне зрабіць!».

Адзін з самых запамінальных выпадкаў у яе практыцы быў такі:

— Аднойчы мне прынеслі 5-гадовую дзяўчынку, скручаную ў клубочак — настолькі цяжкая форма цэрэбральнага паралічу ў яе была, так напружаны былі мышцы. Жывы клубок ні на што не рэагаваў, але прыблізна праз год заняткаў іпатэрапіяй дзяўчынка пачала рухаць ручкамі-ножкамі і нават спрабавала гаварыць. А аднойчы сама пайшла насустрач каню...

Не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло: мама дзяўчынкі аднойчы загаварылася з сяброўкай, а конь якраз вызваліўся. Верачка цягнула маму, а тая захапілася гутаркай настолькі, што не звяртала ніякай увагі. Дзяўчынцы так хацелася апынуцца на кані, ад якога яе аддзяляла літаральна некалькі метраў... Яна ўхапілася сваімі слабенькімі ручкамі за ніжнія парэнчы, і прайшла тыя некалькі метраў практычна на руках. У Валянціны, якая ўсё бачыла, цяклі слёзы, цякуць яны і зараз, калі яна пра гэта расказвае... Няхай хопіць яе душэўнасці і энтузіязму на ўсіх хворых дзетак, якім можа быць карысна Беларускае грамадскае аб'яднанне верхавой язды і іпатэрапіі, няхай становіцца больш такіх цэнтраў і няхай яны каардынуюцца, як робяць гэта згаданае аб'яднанне з магілёўскім цэнтрам іпатэрапіі і прыватным іпатэрапеўтам з Тарасава. Астатняе — за коньмі, а яны свае абавязкі выконваюць бездакорна — шчырасці, цеплыні і дабрыні ім не займаць, а гэтага часам так не хапае людзям...


*Імёны дзяцей зменены па просьбе Валянціны ВІНАГРАДАВАЙ. Па дапамогу звяртайцеся да Валянціны Аляксандраўны па тэлефоне 8-029-756-54-13 альбо заходзьце на сайт: www.sudar-rb.com.*

**Ала МАЧАЛАВА.**
**Фота аўтара.**

Сітуацыя

# Ад планавання сям'і — да нараджэння немаўляці

**Абласны клінічны перынатальны цэнтр адкрыўся ў Гродне на базе рэканструяванага будынка абласнога радзільнага дома. Але змянілася не проста шыльда на медыцынскай установе. Цяпер ва ўмовах адной клінікі будзе аказвацца спецыялізаваная дапамога сямейным парам, жанчынам рэпрадукцыйнага ўзросту, цяжарным і нованароджаным.**

У склад Цэнтра ўвайшлі кансультацыйна-дыягнастычнае аддзяленне «Шлюб і сям'я», аддзяленне медыка-генетычнага кансультавання, клініка-дыягнастычная лабараторыя, аддзяленне прамянёвай дыягностыкі, 14 стацыянарных аддзяленняў і ўнутрыбальнічная аптэка. Шмат было зроблена і для яго аснашчэння.

Так, напрыклад, закуплены камплект для выканання палімеразнай ланцуговай рэакцыі, які дазваляе выяўляць інфекцыйную паталогію — адну з найбольш частых прычын бясплоднасці. А таксама аналізатар эякуляту, з дапамогай якога ўпершыню ў вобласці будзе ажыццяўляцца дыягностыка мужчынскай бясплоднасці.

Для выяўлення прыроджаных парокаў развіцця было набыта спецыяльнае абсталяванне, таму цяпер не трэба накіроўваць жанчын з падазрэннем на храмасомныя і генетычныя парушэнні развіцця плода ў сталіцу, у РНПЦ «Маці і дзіця».

Сродкі для аснашчэння перынатальнага цэнтра былі выдзелены Гродзенскім аблвыканкамам і Міністэрствам аховы здароўя. За тры апошнія гады за сродкі абласнога бюджэту для радзільнага дома былі набыты 176 адзінак найноўшага медыцынскага абсталявання на суму 5,2 млрд рублёў і 39 адзінак на суму 2,2 млрд рублёў — за сродкі Міністэрства аховы здароўя. Акрамя таго, на рэканструкцыю чатырохпавярховага будынка радзільнага дома з абласнога бюджэту было выдзелена 7 млрд рублёў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Фанатам прапаноўваецца забіць гол за дзяўчатак

**Пад назвай «Гол за дзяўчатак!» Міжнародная федэрацыя футбольных асацыяцый (ФІФА) і Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) днямі распачалі новую кампанію, прысвечаную абароне правоў дзяўчатак. Яе мэта — садзейнічанне развіццю адукацыі і ўмацаванню правоў прыгожай часткі чалавецтва сродкамі спорту.**

У час правядзення кампаніі (яе пачатак быў прымеркаваны да адкрыцця ў Кітаі гульняў Сусветнага кубка ФІФА па футболу сярод жанчын) мяркуецца ўсебакова выкарыстоўваць міжнародныя і мясцовыя спартыўныя спаборніцтвы для распаўсюджання ідэй гендэрнай роўнасці, барацьбы з дыскрымінацыяй у адносінах жанчын, паляпшэння агульнай адукацыі дзяўчатак у тых краінах, дзе да вырашэння гэтых праблем ставяцца абыякава.

Як заявіла выканаўчы дырэктар ЮНІСЕФ Эн Венеман, гэтыя важныя ідэі ў ходзе кампаніі яе арганізатары і ўдзельнікі будуць імкнуцца данесці ў першую чаргу да футбольных фанатаў усяго свету.

А прэзідэнт ФІФА Джозеф Блатэр адзначыў, што доўгатэрміновае супрацоўніцтва федэрацыі футбольных асацыяцый з Дзіцячым фондам ААН заснавана на разуменні агульнай для дзвюх гэтых міжнародных аўтарытэтных арганізацый мэты па падтрымцы правоў падлеткаў і моладзі. На яго думку, футбол адыгрывае неацэнную ролю як важны сродак ва ўсталяванні інтэграцыі і ўзаемапаразумення паміж рознымі групамі насельніцтва і нават народамі, дапамагае маладым у цэлым будаваць лепшую будучыню.

Невыпадкова гэта сумесная кампанія разлічана на распаўсюджанне мадэлі школы, прыстасаванай да атрымання якаснай адукацыі дзяўчаткамі. І футбол тут дарадца і памагаты. Так у час сёлетняга Кубка ФІФА ў Кітаі за перамогу змагаюцца 16 лепшых нацыянальных жаночых футбольных каманд свету.

**Леанід ТУГАРЫН.**

■ Брыгада выканае ўсе будаўнічыя работы хутка і якасна з матэрыялу заказчыка.
Тэл. 8-029-761-87-25, увечары.
■ Мяняю 1-пакаёвую кватэру з тэлефонам у цэнтры Віцебска на кватэру ў Маскве ці іншых гарадах Расіі.
Тэл. (8-0212) 96-31-62.
■ Станок балансіровачны б/к, без дакументаў, 550 у.а.
Тэл. 8-029-617-16-97.

# АД ТЭРАРЫСТАЎ — АБАРОНЕНЫ

**Раніцай яны атрымалі задачу і, узброеныя, накіраваліся ў лясную зону. Замаскіраваныя бронетранспарцёры з паветра не распазнаць, уздоўж лясных дарог, нябачныя, дзейнічаюць і вайсковыя патрулі. Ад груп назірання не схаваешся, а ў выпадку сутыкнення з дыверсантамі вайскоўцы падрыхтаваны заняць кругавую абарону.**

Разведка паведаміла — накіроўваецца незнаёмы... «Вы перасягнулі мяжу, спыніцеся, — каля стваранага ў зоне блокпаста затрымліваюць чалавека. — Пакладзіце нам свае дакументы і адыдзіце назад». Вызначэнне асобы, праверка на наяўнасць у чалавека выбуховых рэчываў, боепрыпасаў, зброі.

У іншым месцы заўважана невядомая група людзей. Па вызначаным маршруце, па слядах парушальнікаў шпарка накіроўваюцца вайскоўцы. Раптам грукат аўтаматных чэргаў і, нарэшце, аранжавы дымавы сігнал. З масіву выводзяць палоннага, хутчэй за ўсё — тэрарыста. Са сховішчаў, узяўшы паляну ў шчыльным кальцо, набліжаюцца падрыхтаваныя ў любы момант даць бой салдаты.

Гэта не замалёўка з рэальных вайсковых дзеянняў, а эпізод з вучэбна-баявога занятку мотастралковага падраздзялення 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады, які прайшоў на Барысаўскім агульнавайсковым палігоне. Сёння ва Узброеных Сілах адзначаюць Дзень мотастралкоў. Напярэдадні свайго прафесійнага свята байцы высвятлялі, на што яны здольныя. Як высвятлілася, міратворчыя задачы выконваюцца на вышэйшым узроўні.

— У час падрыхтоўкі і вучобы воінаў мы выкарыстоўваем і вопыт замежных калег, у тым ліку з Украіны, Расіі, Літвы, — расказаў камандуючы Сухапутнымі войскамі генерал-маёр Аляксандр Нікіцін. — Год цяперашні для мотастралкоў надзвычай насычаны. Якасць падрыхтоўкі пастаянна ўдасканальваецца і павышаецца. Для вучобы мы выкарыстоўваем электронныя стралковыя і тактычныя сімулятары, вайскоўцы забяспечаны сучаснымі сродкамі сувязі, экіпіроўкай. Таксама мы пачалі ўводзіць новыя формы, такія як удасканаленне тактыкі бою ў горадзе, адпрацоўка дзеянняў супраць тэрарыстаў. У Беларусі пагрозы нападу тэрарыстаў няма, аднак вайскоўцы павінны быць заўсёды падрыхтаваныя да абароны сваёй краіны і яе людзей.

Сёння ў 72-м Аб'яднаным вучэбным цэнтры падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых ваенных спецыялістаў адбудзецца ўрачысты сход і канцэрт. Прадугледжана віншавальнае выступленне міністра абароны генерал-палкоўніка Леаніда Мальцава. Гасцям ваенна-гістарычны клуб «Мінскі пяхотны полк» пакажа форму адзення пяхоты розных гадоў.

— Я віншую мотастралкоў са святам і жадаю ім моцнага здароўя, поспехаў на службе і шчасця, спакою іх сем'ям, — адзначыў Аляксандр Нікіцін.

**Дзмітрый АЛЬФЕР.**
**Фота БЕЛТА.**



## КОНКУРС ЮНЫХ ТАЛЕНТАЎ

**Юныя лесаводы з розных краін свету сустрэнуцца сёлета на IV Міжнародным юніёрскім лясным конкурсе, які адбудзецца 5—9 кастрычніка ў Санкт-Пецярбургу. Будуць на ім і беларускія школьнікі.**

Нагадаем, што беларускія школьнікі ўжо тройчы ўдзельнічалі ў гэтым маштабным конкурсе, прычым даволі паспяхова. Былі першае і другое месцы, дыплом за лепшае дасягненне ў намінацыі. Такіх поспехаў нашы юныя лесаводы дасягалі дзякуючы актуальнасці і глыбокай распрацоўцы праекта, а таксама правільна пабудаванай прэзентацыі. Спадзяюцца на добрыя вынікі і цяпер.

На конкурс паедзе работа юных лесаводаў з СШ № 3 г. Асіповічы. Васьмікласніцы Дана Бадзеева і Кацярына Пястова вынеслі на суд рэспубліканскага журы навукова-даследчы экалагічны праект «Стратэгія развіцця папуляцыі зубра і бабра ва ўмовах аховы». Гэтая работа адразу выклікала вялікую цікавасць у членаў журы, у складзе якога дасведчаныя спецыялісты ў сферы лясной і паляўнічай гаспадарак.

Падчас рэалізацыі праекта школьніцы вывучалі экалагічныя ўмовы пражывання зубра і бабра, а таксама ацэньвалі стан Асіповіцкай субпапуляцыі гэтых жывёл. Правялі даследаванні па выяўленні дынамікі раёна пражывання зуброў і баброў, іх колькасць і ўзнаўленне папуляцыі і нават падрыхтавалі да выдання кнігу «Рэдкія жывёлы Асіповіцкага прыроднага комплексу».

У рэалізацыі праекта Дане і Кацярыне дапамагалі вопытныя спецыялісты і вучоныя. Зараз юныя лесаводы працуюць над прэзентацыяй свайго праекта і рыхтуюцца да выступлення.

**Марына ПЫРКОВА.**

# Веласіпедааматары перагарэлі?..

## Навучальны год пачаўся. А дзве новыя веласіпедныя стаянкі пустуюць...

**«Мы, студэнты БДУ, просім арганізаваць стаянку для веласіпедаў ва ўніверсітэце ў сувязі з вялікай колькасцю студэнтаў, якія жадаюць дабірацца на заняткі гэтым відам транспарту». Пад гэтай просьбай падпісалася больш як 100 студэнтаў розных факультэтаў. Адміністрацыя ўніверсітэта аператыўна задаволіла просьбу студэнтаў — ужо ў верасні стаянкі ля галоўнага корпуса і ля факультэта РФіЭ чакалі веласіпедааматараў.**

— На жаль, як хутка студэнты «загарэліся» новай ідэяй, так хутка і «перагарэлі», — адзначае намеснік прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце Белдзяржуніверсітэта Ігар Русакевіч. — Вось, напрыклад, Юля, студэнтка 4-га курса факультэта прыкладной матэматыкі, якой належыць ідэя стварыць стаянку, сказала журналісту (Ігар Аляксандравіч паказвае мне чэрвеньскую публікацыю ў газеце «Комсомольская правда в Белоруссии»), што калі пабудуюць стаянку, то да восені яна набудзе «велік». Чамусьці я ўпэўнены, што Юля і зараз дабіраецца ва ўніверсітэт на грамадскім транспарце... Бо больш-менш добры веласіпед зараз каштуе 150 долараў...

Паводле слоў Ігара Русакевіча, ён і сам з задавальненнем ездзіў бы на работу на веласіпедзе. Аднак ёсць некалькі «але»...

— Па-першае, веласіпед дома няма дзе паставіць. Кватэра маленькая. Па-другое, трэба браць з сабой вопратку на змену. Акрамя гэтага, вучэбныя корпусы не забяспечаны душавымі пакоямі (а пасля язды на двухколавай машыне, я думаю, не вельмі прыемна хадзіць увесь дзень потным)... Безумоўна, хацелася б, каб веласіпедныя стаянкі карысталіся попытам, — кажа Ігар Аляксандравіч). — Калі заўважым, што сапраўды ездзяць студэнты ва ўніверсітэт на веласіпедах, то будзем павялічваць колькасць стаянак.

Пасля размовы з намеснікам прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце БДУ, я вырашыла пагутарыць з самімі студэнтамі. Ініцыятар ідэі стварэння стаянкі Юля Дзіковіч на просьбу аб сустрэчы адгукнулася адразу ж. Праз пяць хвілін яна была ў кабінеце пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ.

— Вясной знайшла ў інтэрнэце фотаздымкі веласіпедных стаянак ля БДУІРа, ля ўніверсітэтаў еўрапейскіх краін. Падумала: «чым мы горшыя?». У нас таксама шмат актыўных, спартыўных людзей, якія з задавальненнем дабіраліся б на заняткі на веліку. Акрамя гэтага, ведала, што старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі нашага ўніверсітэта Ніна Міхайлаўна Радзевіч падтрымае любую разумную ініцыятыву студэнтаў (механізм наступны: спачатку збіраем подпісы, а пасля прафсаюз студэнтаў піша ліст-прапанову ў рэктарат).

Да слова, здагадка Ігара Аляксандравіча была, сапраўды, не памылковая. Юля да гэтага часу не набыла веласіпед.

— «Веліка» пакуль у мяне няма. Але ведаю, дзе можна ўзяць на пракат. Трэба гэта рабіць, пакуль надвор'е дазваляе... Ды і фізічная нагрузка патрэбна, бо на чацвёртым курсе фізкультуры няма.

Калі праходзіла ля веластаянкі, убачыла хлопца, які паркаваў свой горны веласіпед на новай стаянцы.

— Пакуль што «велікаў» не шмат — чатыры-пяць., — канстатуе Паша, студэнт пятага курса геаграфічнага факультэта і, як аказалася, кандыдат у майстры спорту па турызму. — Але пастаянна розныя. На мой погляд, стаянка нікому не перашкаджае і месца мала займае. Лепш няхай яна будзе напалову пустая, чым яе зусім не будзе. А студэнты, думаю, хутка актывізуюцца.

**Надзея ДРЫЛА.**

Наш фармат

## «СКУРАНЫ МЯЧ» ПАКАРЫЎСЯ ЛЕПШЫМ

**Завяршыліся фінальныя туры спаборніцтваў юных футбалістаў «Скураны мяч». Сярэдняя ўзроставая група высвятляла, хто з каманд наймацнейшы, на спаборніцтвах у Паставах (Віцебская вобласць), старэйшая — у Пружанах (Брэсцкая вобласць).**

На фінальных матчах у Паставах у тройку лідараў трапілі каманды з Гомеля, Магілёва і саміх Пастаў. Бронзавым прызёрам стала пастаўская каманда «ПМЦ», якая абыграла баранавіцкі «Алімп» з лікам 1:0, на другім месцы — прадстаўнікі Ленінскага раёна г. Магілёва, а пераможцам стаў «Альтаір» з Чыгуначнага раёна г. Гомеля (вынікі матча таксама 1:0). Упершыню сёлета прайшлі таксама спаборніцтвы па элементах тэхнікі футбола і па фізічнай падрыхтоўцы, у якіх журы прысудзіла адразу два першыя месцы прадстаўнікам Пастаў і Мінска. У персанальных намінацыях больш пашанцавала гамяльчанам, сярод якіх аказаўся лепшы варатар (Арцём Сініца) і лепшы нападаючы (Ягор Траянаў), а таксама камандзе Пастаў, у якой лепшы паўабаронца (Міхаіл Бабічаў) і лепшы бамбардзір (Аляксандр Кучараў); лепшым абаронцам назвалі Дзяніса Пузакова з Магілёва.

Фінал у Пружанах выявіў мацнейшых у старэйшай узроставай групе: на першым месцы апынуўся сталічны «Фрунзенец», абыграўшы слуцкі «Алімпік» з лікам 2:1, а трэцяе месца ва ўпартай барацьбе адваявала лідскае «Юнацтва», ігракі якога пацвердзілі майстэрства ў серыі пасляматчавых пенальці. Аргкамітэт турніру таксама вызначыў лепшых у амплуа варатара — Андрэй Максімчук (г. Кобрын), абаронцы — Аляксандр Сакалоў (г. Слуцк), паўабаронцы — Юрый Ільянец (г. Магілёў), нападаючага — Андрэй Пашкеівч (г. Лепель). Лепшым снайперам быў прызнаны Дзяніс Хацкевіч з мінскага «Фрунзенца» — на яго рахунку 7 забітых мячоў. У якасці ўзнагароды хлопцы атрымалі мячы з аўтографамі ігракоў нацыянальнай зборнай.

Медалі і каштоўныя прызы камандам і ігракам забяспечыла дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Прэзідэнцкі спартыўны клуб», а прымаючыя бакі падрыхтавалі для ўсіх сяброў-сапернікаў вялікую культурную праграму. Нагадаем, арганізатарамі спаборніцтваў па традыцыі выступілі Міністэрства спорту і турызму Беларусі, Беларуская федэрацыя футбола і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, да якіх сёлета ўпершыню далучыўся Прэзідэнцкі спартыўны клуб. Усяго ў рэспубліканскіх спаборніцтвах «Скураны мяч» узялі ўдзел 4732 каманды, у складзе якіх больш за 64 тысячы ігракоў.

**Віктар КУШАЛЬ.**

## АЎТААМАТАРЫ СУСТРЭНУЦЦА Ў БАБРУЙСКУ

**Усе аматары хуткіх і прыгожых аўтамабіляў на старт! І зноў драйв, зноў стрэлка спідометраў на мяжы і б'е адрэналін! 29 верасня ў Бабруйску адбудзецца вырашаючы этап адкрытага Кубка Беларусі па драгрэйсінгу.**

Мэта спаборніцтваў — адзначыць найлепшых гоншчыкаў у чатырох намінацыях: Fast Street A (аб'ём рухавіка да 1800 куб. см уключна), Fast Street B (аб'ём рухавіка ад 1800 да 3200 куб. см), Fast Street C (аб'ём рухавіка ад 3200 да 4500 куб. см) і Unlimited Street (прымуць удзел машыны з аб'ёмам рухавіка звыш 4500 куб. см). Паводле вынікаў першага этапа Кубка краіны, які адбыўся ў красавіку, галоўнымі прэтэндэнтамі на першыя месцы на сёння з'яўляюцца Павел Юбіцкі (Мінск), Улад Фецісаў (Мінск), Арцём Гаявы (Гродна), Сяргей Цянь (Кіеў). Вось ужо другі год Бабруйск застаецца сталіцай драгрэйсінга. Арганізатар мерапрыемства Айк Сіманян растлумачыў гэта тым, што горад быў абраны менавіта дзякуючы добраму геаграфічнаму становішчу і вялікаму аэрадрому. Гледачам дакладна не прыдзецца сумаваць, бо акрамя спаборніцтваў адбудзецца канцэрт з удзелам «Нестандартного варианта» і папулярнага танцавальнага праекта «Street masters». І яшчэ адзін бонус для гасцей мерапрыемства — шоў мадыфікаваных аўтамабіляў EMMA Racing, дзе можна будзе ўбачыць найпрыгажэйшыя машыны Беларусі, Украіны і Расіі.

Такім чынам, каб атрымаць масу ўражанняў і прыемных эмоцый, трэба апынуцца на бабруйскім ваенным аэрадроме ў 12 гадзін 29 верасня, дзе пасля ўрачыстай цырымоніі адкрыцця стартуюць паўфінальныя і фінальныя заезды.

**Наталія НОВІК.**

# «Клоўны» і бландзінкі

Адамовіч, Брыль, Быкаў, Казько, Барадулін, Караткевіч, Разанаў... Гэтыя зоркі савецкай эпохі, аказваецца, ніколі не былі ў камуністычнай партыі.

Абмяркоўваю гэта з сябрам, а ён мне: «Гэта не яны «н е б ы л і», а іх — не ўзялі! Бо клоўны!»

«Добра быць коласам, але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком»...

Добра быць клоўнам, але няблага і бландзінкай... Ёсць шанец, што азірнуўшыся калі-небудзь у мінулае, не адчуеш за яго сораму.

# Сугестыўная сіла мастацтва

Была ў выходныя на лецішчы.

Ляжыш сабе пад грушай, глядзіш, як мурашы лезуць на неба... Дробныя шэра-блакітныя птушачкі гойдаюцца на тонкіх галінках барбарысу... Асыпаюцца апошнія пялёсткі позняга маку...

Вечарам уключыла «Сімпсанаў у кіно». Наогул я адданая прыхільніца Сімпсанаў. Мала таго, што паглядзела незлічоную колькасць серый, дык я яшчэ і кнігу прачытала «Сімпсаны як філасофія». А вось «вялікі фільм» дагледзець не змагла. Недзе на палове выключыла — ну не хвалююць мяне амерыканскія праблемы ўтылізацыі смецця... Выключыла і забыла.

А на наступны дзень праходжу міма вядомага масточка праз ручай на станцыі Зялёнае і проста душу мне пераварочвае яго — ручая — забруджанасць. Зняла шлёпкі, залезла ў ручай і пазбірала ў два пакеты ўсё пластыкавае смецце, што там плавала, зачапіўшыся за траву і карані. Калі ўлічыць, што ўсё дно ў бітым шкле, можна ацаніць увесь ідыятызм майго ўчынку...

Вось яна, сугестыўная сіла мастацтва.

# «Дзюдзік» як утопія

Як вядома, адзін з самых масавых жанраў — дэтэктыў.

Але ж нават самыя законапаслухмяныя беларусы не пагодзяцца бачыць на ролях станоўчых герояў-следчых адно толькі міліцыянераў... А іншых персанажаў у айчынным вострасюжэтным чытве і быць не можа. Бо прыватны дэтэктыўны вышук у нас — забаронены законам.

Здавалася б, гэта не мае наўпрост адносінаў да беларускай літаратуры...

А губляем чытача!

# Пацук на шведскім падносе

У маіх знаёмых шмат комплексаў, датычных беларускай культуры.

Адзін з іх — комплекс правінцыйнасці. Раней ім было няёмка за савецкую рэтраграднасць, цяпер — за постсавецкі авангард. Як ні прыйдзеш на выставу сучаснага мастацтва, хто-небудзь абавязкова пачне нудзіць у вуха: маўляў, у Еўропе гэтыя акцыі/перфомансы/ інсталяцыі даўно не ў пашане, і наогул, колькі можна плесціся ў хвасце ды падбіраць рэшткі...

Калі і ў вас падобныя настроі, раю схадзіць у Музей гісторыі і культуры Беларусі, дзе ідзе выстава ювелірнага мастацтва Швецыі.

Аддаўшы тры тысячы рублёў, вы зможаце паглядзець на шкарпэтку, якую шведская мастачка-ювелір павесіла на ланцуг. Міжвольна згадваецца апавяданне рускага пісьменніка А. Аверчанкі «Пацук на падносе», напісанае амаль сто гадоў таму, дзе згадваецца вельмі радыкальны спосаб барацьбы з мастакамі-авангардыстамі, якія злоўжываюць нашай з вамі ўвагай. Пабачыўшы на выставе здохлага пацука і карціну, на якой было «тры трубачкі, бляшанка, нажніцы і аскепак люстэрка», герой апавядання разам з сябрамі абяцае вымазаць наватараў варэннем, пасыпаць канфецці і наклеіць на шчокі ліпкія паперкі ад мух. «Вы самавызначаецеся, — кажа ён, — і я хачу самавызначыцца...»



Дзённік бландзінкі

Акрамя згаданай шкарпэткі, на выставе ў музеі можна пабачыць яшчэ і невялікія пластыкавыя радыятары з антэнай у выглядзе брошкі, і ланцужкі ад унітазных бачкоў...

Цяпер я не буду адчуваць няёмкасць за нашых творцаў: самавызначэнне — гэта тое, што не паддаецца прагрэсу.

# Беларусы і свабода

Неяк з'явілася ў мяне карта — дзе варта пабываць у Беларусі. Другая б павесіла на сцяну ці выкінула, а я стала ездзіць. Садзілася на выходныя ў аўтобус... і вось траціна населеных пунктаў, пазначаных на карце, ужо адзначана крыжыкам.

Ехаў неяк наш аўтобус — а былі ў ім пераважна школьнікі — па старой дарозе Случчыны. І экскурсавод кажа:

— Звярніце ўвагу на дрэвы... На іх вешалі паўстанцаў. Здымаць целы было забаронена, падпілоўваць ствалы — таксама. І ўся дарога была ў шыбеніках — бо вешалі за любы данос. А па начах прыходзілі сваякі і дрэвы гэтыя рукамі падкопвалі — каб хутчэй звалілася разам з целам. А яшчэ рабілі пад камлём невялікую пячору і ставілі туды запаленую свечку і абраз. Калі вы ўгледзіцеся, то пабачыце гэтыя рукатворныя падкопы...

І дадаў:

— Калі ў вас узнікне пытанне: за што ж беларусы так не любяць свабоду? — успомніце гэтыя дрэвы.

Вось днямі я іх і ўзгадала. Прачытала, як невядомыя мне дзядзькі абмяркоўваюць, што я маю права пісаць ва ўласны дзённік, а што не маю — і ўзгадала.

# Астралогія — навука пра астры

У Генры Мілера быў герой, настолькі абазнаны ў астралогіі, што мог вызначыць дакладную дату нараджэння, толькі пагаварыўшы з чалавекам.

Цяпер газеты і ТБ святкуюць 80-годдзе Алеся Адамовіча. Але сямейнікі ведаюць, што нарадзіўся ён на год раней пазначанай у пашпарце даты, і не ў верасні, а ў жніўні.

Такім чынам, ён не ПАННА + КОТ, а ТЫГР+ЛЕЎ.

Можа, недавер да астралогіі і звязаны якраз з тым, што цэлае пакаленне людзей вымушана было хаваць свае сапраўдныя метрыкі?

# «Слабасці» Быкава

Чытаю ўражанні беларускага паэта Алеся Аркуша ад зборніка «Паветраны шар»:

«Лепшыя тэксты, адназначна: «Жоўты пясочак» Быкава і «Аўтобус колеру бэз» Сідарука. Хрэстаматыйныя рэчы. І тое, што раней казалася слабасцю Быкава: унутраныя ваганьні і сумненьні аўтара, недавыказанасьць, трагедыйнасьць, адсутнасьць хэпі-энду, лапідарны неэмацыйны стыль, адсутнасьць мяжы паміж дабром і злом, — аказаліся яго сілаю (мастацкай)».

Цяжка паверыць — няўжо Аркуш сапраўды раней ацэньваў трагізм менавіта як слабасць Быкава?

Ёсць такое дапатопнае слова «піэтэт» — «глыбокая павага»... Іншым разам менавіта піэтэт утрымоўвае мяне ад раздачы «кампліментаў» класікам.

**Ганна КІСЛІЦЫНА.**

# Быць рабом вярбоўшчыка ці не — залежыць толькі ад цябе

**Гандаль людзьмі — праблема міжнароднага характару, якая не выдзяляе людзей па ўзросту, полу ці прафесіі. У некаторых дзяржавах гандаль людзьмі па даходнасці перавышае гандаль наркотыкамі. Гульня на пачуццях людзей, якія хацелі б мігіраваць у іншую дзяржаву, на іх надзеях і марах не абышла і нашу краіну. У Беларусі працэс вярбоўкі праходзіць як у вялікіх, так і ў малых гарадах. У якасці вярбоўшчыкаў могуць выступаць фірмы па працаўладкаванню, турысцкія і мадэльныя агенцтвы. Але адным з самых распаўсюджаных метадаў вярбоўкі з'яўляецца асабістая вярбоўка. І калі вы ўжо сабраліся ехаць за мяжу працаваць ці вучыцца, то ўважліва праверце інфармацыю аб тым, што вас чакае.**

**УРА! Я ЕДУ ЗА МЯЖУ!**

Вам патэлефанаваў добры знаёмы ці сусед і прапанаваў працу за мяжой за добрыя грошы? І вы вырашылі паспрабаваць. Памятайце, што ў вашым пашпарце павінна стаяць віза, якая гарантуе мэту выезду. Вы павінны ведаць дакладны адрас месца, дзе будзеце жыць, а таксама адрас месца вучобы, працы ці адпачынку. Любы дакумент, які падпісваеце, павінен быць складзены ў зразумелай форме на вядомай вам мове і падпісваецца ён да ад'езду за мяжу.

**ВІЗА, ЦІ «САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ?»**

Каб атрымаць візу, вы павінны звярнуцца з запытам у пасольства ці консульства той дзяржавы, куды хочаце паехаць. Існуе шмат тыпаў віз, асноўныя з іх — гэта працоўная, турысцкая, шлюбная. Таксама вялікім попытам карыстаюцца гасцявыя і студэнцкія візы. Будзьце гатовыя да таго, што візу не так лёгка атрымаць і ў адкрыцці візы вам могуць адказаць без раскрыцця прычын. Але калі вы — ахвяра вярбоўшчыка, то вам нават і клапаціцца пра візы не патрэбна: усё зробяць за вас.

**РАБСТВА МНАГАЛІКАЕ**

Сучаснае рабства існуе ў розных формах. Найчасцей сярод дзяўчат-ахвяраў сустракаюцца прымушэнне да аказання сэксуальных паслуг, стрыптызу, парнаграфіі. Маладых людзей прымушаюць да працы на падпольных фабрыках і заводах, да крадзяжу і жабравання. Незаконная трансплантацыя органаў, гандаль нявестамі, прымушэнне да рэгістрацыі шлюбу і цяжарнасці, прымушэнне да працы ў якасці хатняй прыслугі ці да догляду дзяцей — гэта ўсё можа хавацца за прыгожымі абяцаннямі і словамі вярбоўшчыкаў.

**«ГАРАЧАЯ» ЛІНІЯ «ЛА СТРАДА» — МАГЧЫМАСЦЬ ПРАВЕРЫЦЬ ІНФАРМАЦЫЮ**

Праграма «Ла Страда» актыўна працуе над тым, каб не дапусціць дзейнасці вярбоўшчыкаў у Беларусі. Асноўная праца вядзецца па «гарачай» лініі «Ла Страда», якая дзейнічае з 2001 года. «За гэты час паступіла больш чым 12 000 званкоў. У патэнцыяльную групу рызыкі ўваходзяць жанчыны ва ўзросце ад 21 да 40 гадоў, якія хочуць паехаць за мяжу працаваць ці ў якасці жонкі. Часцей за ўсё людзей цікавяць пытанні працы за мяжой, рэгістрацыя ці скасаванне шлюбаў, таксама правы дзяцей у міжнародных шлюбах. Найбольш папулярныя дзяржавы для беларусаў — Германія, Расія, Вялікабрытанія і ЗША», — гаворыць Алена Несцярук, менеджар праграмы «Ла Страда».

«Ла Страда» не толькі праводзіць кансультацыі па бяспечным выездзе за мяжу, але і дапамагае жанчынам, якія сталі ахвярамі. Ужо традыцыйным стала правядзенне лекторыяў, сустрэч з моладдзю. Напрыклад, нядаўна ў рамках праграмы «Ла Страда» сумесна з ГА «Беларуская асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын», УП «Кінавідэапракат» Мінгарвыканкама, гуртам «DALI», Аўстрыйскімі авіялініямі пры падтрымцы Швейцарскага офіса па супрацоўніцтву ў Беларусі прайшлі дні адчыненых дзвярэй у кінатэатры «Перамога». На працягу трох дзён усе ахвотныя мелі магчымасць бясплатна паглядзець фільмы — прызёры міжнародных фестываляў, аб'яднаныя адной тэматыкай: бяспечны выезд за мяжу.

«Гарачая» лінія «Ла Страда» працуе кожны дзень, тэлефануйце па нумары 8-801-100-8-801 з 9.00 да 21.00. Званкі на тэрыторыі Беларусі бясплатныя.

**Надзея БАС.**

# ДЭЗЕРЦІРЫ ХАВАЛІСЯ Ў РАСІІ

**Беларускай ваеннай пракуратурай сумесна з іншымі праваахоўнымі органамі вядзецца актыўны вышук злачынцаў у пагонах.**

Паводле звестак Генеральнай пракуратуры краіны, сёлета, напрыклад, былі знойдзены і затрыманы двое вайскоўцаў, якія некалькі гадоў таму самавольна пакінулі месца службы і хаваліся на тэрыторыі РФ. Устаноўлена таксама месцазнаходжанне яшчэ васьмі такіх уцекачоў, якія былі аб'яўлены ў міжнародны вышук. Зараз вырашаецца пытанне аб экстрадыцыі гэтых асобаў на радзіму.

Увогуле, у беларускім войску сёлета істотна ўмацавалася дысцыпліна. У першым паўгоддзі было зафіксавана ўсяго 5 злачынстваў, звязаных з ухіленнем ад праходжання вайсковай службы. Гэта на 17 працэнтаў менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. У прыватнасці, Мінскай міжгарнізоннай ваеннай пракуратурай расследуецца крымінальная справа, узбуджаная супраць радавога вайсковай часці, які ў чэрвені гэтага года самавольна пакінуў месца службы ў Красненскім гарнізоне. А ў Віцебскай вобласці да крымінальнай адказнасці прыцягваецца салдат, які збег з палігона.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

# «ХАКЕІСТ» «УКАМПЛЕКТАВАЎСЯ» НА 70 МЛН

**У Мінску невядомы крымінальнік пранік у магазін спартыўных тавараў, што знаходзіцца на вуліцы Кісялёва, і выкраў адтуль хакейную амуніцыю.**

Здарэнне адбылося пасля закрыцця магазіна. Злачынца трапіў у памяшканне, узламаўшы ралеты і адціснуўшы аконныя рашоткі. Магазін не быў абсталяваны ахоўнай сігналізацыяй. Кошт выкрадзенага ацэньваецца ў 70 млн рублёў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Пазнай свой край

# У ТАЯМНІЧЫХ УЛАДАННЯХ КАРАЛЕВЫ БОНЫ, *альбо Рагачоўская казка-быль...*

**У імклівай кругаверці сталічнага жыцця людзям часта не хапае часу не толькі паглядзець тэлевізар альбо пачытаць газету, каб даведацца аб апошніх навінах у краіне, а нават паесці ці прыбраць у кватэры. Што ж тут гаварыць аб веданні мінулага, калі не хапае часу даведацца аб сучасным?..**

Стаміўшыся на рабоце і ледзь прывалачыўшы ногі дадому, хочацца толькі аднаго — заваліцца на ложак і адпачываць. Калі ж надыходзіць час доўгачаканых водпускаў, гарадскія жыхары, назбіраўшы за год настойлівай працы дастаткова грошай, накіроўваюцца ў якую-небудзь экзатычную краіну, каб пазнаёміцца з яе славутасцямі, культурай. І тут паўстае пытанне: а чаму патрэбна далёка ездзіць, калі можна добра правесці час на сваёй роднай зямлі? Колькі дзіўных, цікавых і дагэтуль невядомых мясцін ёсць у нашай краіне, якія захоўваюць часцінку мінулага і традыцыі беларускай зямлі!

Так, ёсць на поўначы Гомельскай вобласці адзін невялікі, але вельмі прыгожы горад, які лічыцца адным з найстарэйшых паселішчаў на Беларусі. Рагачоў па праву называюць калыскай беларускай гісторыі. Заснаваны ў 1142 годзе, з цягам часу горад не згубіў той далёкай атмасферы мінуўшчыны, духу старадаўнасці. А хутчэй, наадварот, увабраўшы ў сябе подых сучаснасці, прыдбаў своеасаблівы і непаўторны каларыт.

Рагачоў размешчаны ў месцы злучэння Дняпра з Друццю. Пры зліцці гэтых дзвюх рэк утварыўся так званы «рог». Мажліва, адсюль і пайшла назва горада. Гэта версія лічыцца самай распаўсюджанай сярод мясцовых жыхароў. А вось галоўны захавальнік фондаў Рагачоўскага музея Народнай славы М. Альха разважае інакш:

— На маю думку, больш правільна было б сказаць, што назва горада ўтварылася ад старалітоўскага слова «рогас», што значыць «царква, свяцілішча».

Рагачоўшчына па праву ганарыцца сваімі шматлікімі арыгінальнымі помнікамі архітэктуры, якія захаваліся з часоў нашых продкаў і навяваюць успаміны аб далёкім мінулым нашага краю. Касцёл Святога Антонія XIX ст., капліца XIX ст., Троіцкая царква ў вёсцы Дварэц XIX ст., Пакроўская царква ў вёсцы Доўск XIX ст... Гэты спіс можна працягваць вельмі доўга, аднак мне хацелася б спыніцца на самым незвычайным і самым вядомым помніку Рагачова, аб якім ходзіць нямала чутак і міфаў. Гэта Замкавая гара... Калі чалавек трапляе на гэтае месца, то адразу пранізваецца атмасферай містыкі і незвычайнай таямнічасці.

Як сведчыць гісторыя, некалі на гэтай гары ўзвышаўся палац знакамітай каралевы Боны Сфорца. Адну з легендаў аб заснаванні Рагачова расказала жыхарка горада З. Блешанкова:

— У час прыняцця хрысціянства полацкая князёўна зрабіла падарожжа ў Кіеў, каб паглядзець на ўласныя вочы, што ж уяўляе сабой гэтая новая з'ява. Яе вельмі ўразіла грубая расправа з былымі багамі і гвалтоўнае хрышчэнне ў Дняпры. Вяртаючыся ў дрэнным настроі на караблі ў Полацк, каралева захаплялася маляўнічымі берагамі і міжволі шукала добрае месца, дзе можна было б спыніцца і апамятацца пасля кіеўскіх стрэсаў. Раптам яна ўбачыла высокі прыгожы мыс, зусім дзікі і бязлюдны. Сышоўшы з карабля, князёўна любавалася навакольнай мясцовасцю з Замкавай гары. Яна вырашыла: тут будзе горад. Як сказала, так і зрабіла — вырас гарадок, з'явіўся прыгожы церам. Бона пасяліла там палову сваёй дружыны і, адпачыўшы, паехала ў Полацк.

Вось такім чынам, на думку некаторых жыхароў, узнік Рагачоў. На самай жа справе існуе вельмі шмат меркаванняў. Калі ж верыць навуковым крыніцам, то дзесьці ў канцы XV стагоддзя Вялікі князь Літоўскі і кароль Польскі Жыгімонт І Стары падарыў Рагачоў сваёй жонцы Боне з міланскіх герцагаў роду Сфорца. Больш за 30 гадоў кіравала каралева сваімі ўладаннямі, у тым ліку і Рагачовам. Яна вызначалася ўладалюбствам і прагай да бурнай дзейнасці, сама ўнікала ва ўсе дробязі справы сваёй вялікай гаспадаркі.

Каралева Сфорца імкнулася да лідарства і ў сваёй сям'і. Яна была добрай жонкай, строгай, аднак справядлівай маці. Кажуць, што яна вельмі апякала сваіх дзяцей. Ходзіць нават такая легенда, нібы ў дачку каралевы Боны некалі закахаўся чарнігаўскі князь. Але ганарлівая італьянка за нешта прагневалася на яго і схавала дачку ў Рагачоўскім замку. Дзень і ноч сцерагло дзяўчыну войска ад замахаў князя. І князь вырашыў выкрасці яе, і, здаецца, па ўзаемнай дамоўленасці. Ён вырыў падземны ход аж да самай Замкавай гары. Выкраў князь сваю каханую ці не, ніхто не ведае — канец легенды згублены.

У 1535 годзе ў час руска-літоўскай вайны горад быў разбураны, пасля чаго каралева Бона вырашыла паставіць тут паводле праекта італьянскага архітэктара замак. На яго будаўніцтва прыцягвалася навакольнае насельніцтва. Рагачоўскі замак складаўся з комплексу мураваных будынкаў, драўляных сцен агароджы, абарацяльнага рова з вадой, пад'ёмнага моста. У цэнтры комплексу стаяў палац — аднапавярховы прамавугольны ў плане будынак з мезанінам. Перапіска Боны са служачымі дазваляе зрабіць выснову аб вялікай цікавасці каралевы да будаўніцтва замка ў Рагачове. Вядома, што яна даволі рэгулярна наведвала свой палац. Там нават існаваў рагавы аркестр. Аднак лёс не пашкадаваў будынак, і ў 1654 годзе, у час руска-польскай вайны, ён быў спалены. Ад былога замка застаўся толькі корпус. Яго выкарыстоўвалі для самых розных мэтаў: як ваенны магазін, склад, і нават астрог. Будынак быў разбураны дашчэнту ў гады Вялікай Айчынай вайны.

Шмат чутак ходзіць аб знаходках скарбаў на Замкавай гары. Існуе паданне, што яшчэ перад Другой сусветнай вайной нейкаму інжынеру-прарабу было выдзелена шмат золата на будаўніцтва маста. Але пачалася вайна і інжынер схаваў гэтае золата недзе ў раёне Замкавай гары, а сам знік. Гэта багацце нібыта і зараз там захавана.

Навуковы супрацоўнік Рагачоўскага музея Народнай славы А. Рыкуноў паведаміў наступнае:

— На гары неаднаразова працавалі археалагічныя экспедыцыі. Адзіночныя манеты знаходзяць даволі часта. Таксама вядомы няпоўны скарб паўгрошай Жыгімонта І Старога. Многія жыхары не губляюць надзею знайсці захаванае золата. Аднак ніхто дакладна не ведае, ёсць яно там ці не.

Сёння Замкавая гара — адно з улюбёных месцаў рагачоўцаў. Ні адно свята ці мерапрыемства не абыходзіцца без гулянняў і канцэртаў ва ўладаннях каралевы Боны. А выпускнікі школ горада кожны год збіраюцца на гэтым чароўным месцы, каб сустрэць усход сонца, усход свайго новага дарослага жыцця.

Замкавая гара і іншыя гістарычныя славутасці горада прыцягваюць сваёй загадкавасцю і таямнічасцю. І дастаткова хоць бы раз пабываць тут, каб на ўсё жыццё ўвабраць у сябе часцінку далёкай мінуўшчыны, культуры сваёй Бацькаўшчыны. Аднак хараство Рагачоўскага краю адкрывае сваё сэрца не кожнаму, а толькі чуйным і спагадлівым людзям. Каб адчуць усю яго прыгажосць і незвычайнасць, трэба дакрануцца і ўважліва ўгледзецца ў навакольную прыроду: у блакіт рэк і азёраў, заплюшчыць вочы і ўслухацца ў меладычны спеў птушак, радасна ўсміхнуцца, натрапіўшы на чароўны астравок палявых кветак. Сапраўдны цуд жывой прыроды...

Здаецца, што Рагачоўшчына — адасоблены ад усяго свету астравок цішыні і спакою, месца адвечнай мудрасці і рэдкай гармоніі, дзе час запаволіў свой бег, каб як мага даўжэй зберагчы свой вялікі скарб — дух мінуўшчыны і гісторыю беларускай зямлі...

Дык можа варта хоць бы раз у жыцці адпачыць не на экзатычным курорце Турцыі альбо Італіі, а ў роднай дзіўнай Беларусі?..

**Вікторыя РАГОЖНІКАВА.**

POST factum

## САБАКА-МІЛЬЯНЕР ШУКАЕ ГАСПАДАРА



**Пародзістая балонка, якая ў жніўні атрымала ў «спадчыну» 12 мільёнаў долараў ад сваёй гаспадыні, амерыканкі Леоны Хелмслі, не можа знайсці сабе новага гаспадара.**

Місіс Хелмсі, якая некалі валодала «візітоўкай» Нью-Йорка — хмарачосам Empire State Building — памерла месяц назад ва ўзросце 87 гадоў, пакінуўшы найбольшую долю свайго багацця ў спадчыну любімаму сабачку па мянушцы Трабл (імя перакласці можна як «Неспакойны»). Ці то мянушка сабакі, ці то ягоны характар таму прычынай, аднак 80-гадовы брат нябожчыцы Элвін Розенталь, якому дасталося крыху менш, чым сабаку, — 19 мільёнаў долараў, адмаўляецца выканаць апошняе пажаданне сваёй сястры і прыняць пад сваю апеку сабаку са шматмільённым багаццем.

## САМАЯ ЗАГАДКАВАЯ ЎСМЕШКА РАЗГАДАНАЯ?

**Загадкавая ўсмешка «Джаконды» Леанарда да Вінчы належыць зусім не Лізе Джэрардзіні, жонцы багатага фларэнційскага негацыянта Франчэска Джаконда.**



Да такой высновы прыйшлі аўтары кнігі «Мона Ліза. Скрыты твар Леанарда». Кніга складаецца з трох эсэ, напісаных амерыканскай мастачкай Ліліян Шварц, фларэнційскім гісторыкам архітэктуры Рэнца Манэці і заснавальнікам Музея ідэй Леанарда ў яго родным горадзе Вінчы Алясандра Вецозі. Асновай для кнігі паслужыла нашумелае даследаванне Л. Шварц, якая некалькі гадоў назад сумясціла на камп'ютары асноўныя лініі твару Джаконды і аўтапартрэта Леанарда і пераканалася, што яны цалкам супадаюць.

## РУСКАГА АМЕРЫКАНЦА АБВІНАВАЧВАЮЦЬ У «ІДЭАЛЬНЫМ ЗАБОЙСТВЕ»

**Паліцыя ЗША падазрае іміграната з Расіі ў «ідэальным забойстве»: дзве ягоныя палюбоўніцы памерлі пры загадкавых абставінах, прычым абставіны гэтыя дакладна супадаюць з тымі, што апісаны ў яго апавяданнях.**

Пакуль ніякіх прамых улік адносна Яўгена Перчыкава, якога вышуквае паліцыя, няма, піша брытанская газета «Тэлеграф». Вядома толькі, што незадоўга да смерці абедзве жанчыны па падказцы менавіта Перчыкава афармілі страхоўкі на буйныя сумы грошай. А ў сваякоў загінулых падазрэнне выклікае серыя апавяданняў, дзе Перчыкаў апісвае спробы ўчыніць «ідэальнае забойства». Дэталі гэтых літаратурных твораў практычна супадаюць з абставінамі загадкавых смерцяў жанчын. Верагоднымі ахвярамі апісаных забойстваў сталі Ларыса Васэрман і Таццяна Каркова, жанчыны сярэдняга ўзросту, абедзве — таксама імігранткі з Расіі.

Адна з жанчын памерла ў Брукліне (раён Нью-Йорка) у 2002 годзе, і тады Перчыкаву ўдалося пасля яе смерці атрымаць 500 тысяч долараў страхоўкі. Аднак пасля раптоўнай смерці ў 2005 годзе другой жанчыны страхавая кампанія адмовілася выплаціць яму раўнацэнную суму. Літаральна днямі суд адмовіў у разглядзе іскаў родных гэтых жанчын, якія ўпэўнены ў дачыненні Перчыкава да гэтых смерцяў. Тым не менш акруговы пракурор Манхэтэна працягвае расследаванне гэтай справы. Адзначым, што ў абодвух выпадках каранер (следчы, які першапачаткова займаецца справамі аб гвалтоўнай або раптоўнай смерці) не змог устанавіць, ад чаго памерлі жанчыны. Уісках жа сцвярджаецца, што Перчыкаў угаварыў іх застрахаваць свае жыцці на буйныя сумы, выкарыстаўшы сфальсіфікаваную інфармацыю і прызначыўшы атрымальнікам страхоўкі менавіта сябе.

## САКРЭТ ПОСПЕХУ

**Два новыя даследаванні паказалі, чаму адны людзі больш прывабныя для прадстаўнікоў процілеглага полу, чым іншыя...**

Універсітэт Фларыды ўстанавіў, што знешне прывабныя людзі практычна імгненна прыцягваюць увагу суразмоўцы, прычым ад іх цяжка адвесці вочы. Гэты вывад быў зроблены ў выніку серыі псіхалагічных эксперыментаў, у час якіх вызначалася, на каго накіроўваюць позірк людзі ў першыя секунды пасля знаёмства. Тут была заўважана цікавая асаблівасць: халастыя (незамужнія) удзельнікі эксперыменту пераважна глядзелі на прывабных суразмоўцаў процілеглага полу, тады як сямейныя людзі, часцей за ўсё, — на прадстаўнікоў свайго полу.

Аўтары даследавання лічаць, што гэтая асаблівасць паводзінаў выпрацавалася ў выніку эвалюцыі: чалавек спрабуе знайсці сабе дастойную пару, каб завесці патомства. Калі ж гэтая задача вырашана, то ён цікавіцца патэнцыйнымі... супернікамі.



У той жа час сумеснае даследаванне Універсітэта Ракфелера і Універсітэта Дзьюка дазволіла ўстанавіць, што жанчыны па-рознаму ўспрымаюць пах мужчыны. У час доследаў вывучалася ўспрыманне жанчынамі аднаго з інгрэдыентаў мужчынскага паху — ферамону андрастэнону, які ўтрымліваецца ў поце. Вынікі аказаліся дзіўнымі: адной частцы жанчын гэты пах не падабаўся катэгарычна, другая частка лічыла яго дастаткова прывабным, а трэцяя частка наогул ніякага паху не адчувала. Аўтары даследавання сцвярджаюць, што прычынай гэтага з'яўляюцца адрозненні ў рэцэптарах, якія адказваюць за нюх, — у розных людзей яны розныя. Таксама даўно вядома, што ў сысуноў (і ў чалавека) пах з'яўляецца адным са спосабаў прыцягнення ўвагі прадстаўнікоў процілеглага полу.

# «ЛЮБЛЮ АДЧУВАЦЬ, ШТО МЯНЕ АБАРОНЯЦЬ», —

## прызналася 17-гадовая Ірына Мішчук, чэмпіёнка Еўропы па цяжкай атлетыцы сярод кадэтаў

**Юнацтва. Час, калі мы яшчэ толькі марым пра тое, што абавязкова споўніцца, і аб тым, чаго ўвогуле не можа быць на зямлі. Пачынаем складаць планы нашай непрадказальнай будучыні, рабіць першыя крокі насустрач самастойнаму жыццю. Так бывае ў большасці выпадкаў, але не заўсёды...**

З Ірынай Мішчук я пазнаёміўся 2 гады таму, калі яна стала сярэбранай прызёркай чэмпіянату Еўропы сярод кадэтаў. Добра памятаю, як ехаў з ёй на сустрэчу і ўяўляў сабе не дзяўчыну, а, прабачце, грамілу, якая на адным дыханні падымае 68 кілаграмаў жалеза. І памятаю, як здзівіўся, калі мяне сустрэла звычайнае, нічым не адрознае ад астатніх, дзяўчо, гледзячы на якое ніколі не скажаш, што перад табой стаіць майстар спорту Рэспублікі Беларусь.

Цяжкаатлетку Ірыну Мішчук для беларускага спорту адкрыў яе трэнер Аляксандр Самадаеў:

— Тры гады таму я прыехаў на Маларытчыну ў пошуках спартыўных талентаў. На прагляд са школ раёна былі сабраны лепшыя хлопцы і дзяўчаты. Не заўважыць сярод іх Ірыну было проста немагчыма: дзяўчынка вагой 38 кілаграмаў і ростам 146 сантыметраў змагла 60 разоў адціснуцца ад падлогі і 15 разоў падцягнуцца на перакладзіне. Не кожны юнак зможа выканаць такія нарматывы, а тут дзяўчынка! Зразумела ж, запрасіў яе ў Брэст, дзе мы і вызначыліся, чым Ірына будзе займацца далей. Штанга — такі быў яе выбар. І ведаеце, мы не памыліліся. Не прайшло і года, а Ірына Мішчук — сарэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы па цяжкай атлетыцы сярод кадэтаў. Яшчэ два гады трэніровак, і сёлета яна, прадэманстраваўшы выдатны вынік: рывок — 82 кілаграмы і штуршок — 87 (вага самой Ірыны — 53 кілаграмы), стала пераможцай гэтага чэмпіянату. Да таго ж у рыўку Ірына Мішчук усталявала новы рэкорд Еўропы.



— Якія планы на найбліжэйшую будучыню?

— Зараз актыўна рыхтуемся да чэмпіянату Еўропы сярод юніёраў, які пройдзе ў пачатку кастрычніка ў Іспаніі. Надзея калі не на перамогу, то на прызавое месца дакладна. Плануем таксама, што сёлета студэнтка першага курса Брэсцкага вучылішча алімпійскага рэзерву Ірына Мішчук выканае нарматывы майстра спорту міжнароднага класа.

Сама Ірына — дзяўчына даволі сціплая. І калі пачынаеш з ёй абмяркоўваць дасягненні, яна лаканічна адказвае:

— Мне пашанцавала — я знайшла сябе, займаюся тым, што мне сапраўды падабаецца, дзе магу самарэалізавацца. А гэта, як і любы іншы сапраўдны занятак, патрабуе нямала вытрымкі, сіл і намаганняў. Ведаеце, як гаворыцца: «Для таго, каб менш працаваць потым, неабходна больш працаваць зараз».

— Прабач, а як, калі не сакрэт, твая маці ставіцца да таго, што дачка займаецца цяжкай атлетыкай?

— Спачатку хацела мяне адгаварыць, але, калі пераканалася, што цяжкая атлетыка — гэта маё, падтрымала. Ды і хіба ж дзяўчына не можа быць моцнай? Галоўнае, каб у душы яна пакінула месца жаноцкай мяккасці і слабасці. Вось я, напрыклад, люблю адчуваць, што мяне абароняць.

— Якой ты ўяўляеш сябе ў будучым?

— Як любы салдат павінен марыць стаць генералам, так кожны спартсмен павінен марыць пра алімпійскае золата. Я таксама спадзяюся на такія ж поспехі, якіх дасягнуў мой зямляк і мой ідэал у спорце Леанід Тараненка.

Глядзіш на Ірыну Мішчук — і хочацца назваць яе каралевай рыўка, але не: пакуль яна — прынцэса. Прынцэса, якая абавязкова стане каралевай, здабыўшы сабе алімпійскае золата.

**Аляксандр АЛЕСІК.**
**Фота аўтара.**

## Аб'яўлены конкурс на лепшую публікацыю ў СМІ аб Узброеных Сілах Беларусі

**Міністэрства абароны Беларусі сумесна з Міністэрствам інфармацыі праводзіць штогадовы творчы конкурс на лепшае асвятленне ў СМІ пытанняў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл Беларусі. У гэтым годзе конкурс прымеркаваны да 90-годдзя Узброеных Сіл, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Мінабароны.**

Для ўдзелу ў конкурсе прымаюцца матэрыялы, размешчаныя ў рэспубліканскім і рэгіянальным перыядычным друку, а таксама тэле- і радыёматэрыялы, якія выходзілі ў эфір з 1 лютага 2007 года па 1 лютага 2008-га. Удзельнічаць у конкурсе могуць толькі прадстаўнікі СМІ, якія зарэгістраваны ў Міністэрстве інфармацыі.

Конкурсныя матэрыялы можна накіроўваць у Мінабароны на працягу ўсяго перыяду правядзення конкурсу на адрас: 220034, Ф-2 г. Мінск-34, Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы з паметкай «Конкурс на лепшую публікацыю».

**Ягор ДУДКІН, БЕЛТА.**

# СТУДЭНТКА, АКРАБАТКА І ВЕЛЬМІ ДОБРЫ ЧАЛАВЕК

***Мілая, прывабная дзяўчына з прыгожай усмешкай на твары. Душа яе поўніцца аптымізмам і добрай энергіяй, а ў вачах — незгасальны бляск.***

***Яна не зможа дараваць здраду нават самаму блізкаму чалавеку, а ад моцнай крыўды можа заплакаць. Яна асоба цікавая, неардынарная, жыццярадасная.***

***Марыць стаць арт-дырэктарам.***

***Знаёмцеся: Наталля Соткіна, удзельніца дзіцячага цырка «Транзіт», лаўрэат міжнародных фестываляў — гераіня маёй сённяшняй нататкі.***

У дзяцінстве Наталля Соткіна вельмі любіла хадзіць у цырк. З уласцівымі любому дзіцяці сапраўдным захапленнем і непасрэднай радасцю дзяўчынка дзівілася на вясёлых клоўнаў, фокуснікаў, дрэсіраваных жывёл. А колькі ўражанняў пакідала выступленне жанглёраў, акрабатаў і тых, хто з такой грацыёзнай лёгкасцю катаецца на аднаколавым веласіпедзе!

Тады маленькая Наташка яшчэ не ведала, што калі ёй будзе сем гадоў, яна, прачытаўшы ў школе аб'яву аб наборы дзяцей у дзіцячы цырк «Транзіт», вырашыць паспрабаваць свае сілы. А ўжо праз некаторы час сама будзе здзіўляць усіх сваімі акрабатычнымі нумарамі і з усё той жа грацыёзнай лёгкасцю катацца на матацыкле (так называецца аднаколавы веласіпед).

У восем гадоў адбыўся Наташын дэбют. Разам са сваёй цыркавой групай, кіраўніком якой быў Ігар Аляксеевіч Крапін, дзяўчынка выступала для дзяцей з анкалагічнымі захворваннямі ў адным з Мінскіх дзіцячых санаторыяў.

Зразумела, каб дабіцца вялікіх поспехаў у сваёй нялёгкай працы, ад Наташы патрабавалася шмат намаганняў, стараннасці, цярплівасці. Дзяўчынка не прапускала ніводнай рэпетыцыі, што праводзіліся тры разы на тыдзень, старанна ўдасканальвала свае навыкі, і гэта не прайшло дарэмна. Выступленні Наталлі Соткінай захапляюць і часам нават здзіўляюць. Як доказ — тое, што дзяўчынка разам са сваёй групай аб'ездзіла шмат краін. Уражвалі сваімі выступленнямі Бельгію, Францыю, Германію, Галандыю, Польшчу. Кожная з гэтых краін пакінула ў сэрцы нешта сваё, незабыўнае.



— Хочацца адзначыць, што ў кожнай краіне нас сустракалі вельмі цёпла і гасцінна, — успамінае Наташа. — Наша група была такой дружнай і вясёлай, мы пабачылі шмат новага і цікавага. Асабліва, безумоўна, запомнілася і ўразіла Эйфелева вежа...

Наташа сапраўдны майстра такіх цудоўных нумароў, як акрабатычны дуэт, акрабатычная тройка. Яна віртуозна катаецца на аднаколавым веласіпедзе, выконвае ўсходні танец.

...Жыццёвыя абставіны склаліся так, што дзяўчына не звязала сваё прафесійнае жыццё з цыркавым майстэрствам. Сёння Наташа Соткіна — студэнтка 3-га курса факультэта хіміі, тэхналогіі і тэхнікі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, але і зараз цырк для яе застаецца самым любімым захапленнем.

Узорная навучэнка, цікавая, яркая, неардынарная асоба, добразычлівы, адказны, спагадлівы чалавек, надзейны і верны таварыш — так Наталлю характарызуюць яе аднакурснікі.

Ганарацца сваёй дачушкай і бацькі — а як жа інакш? Дзяўчына не проста таленавітая, яна не пакідае сваёй любімай справы нават зараз, падчас вучобы ва ўніверсітэце, што, згадзіцеся, не зусім лёгка.

Без яе ўдзелу не абыходзіцца ніводнае ўніверсітэцкае свята — Наталлю запрашаюць выступаць на кожнае мерапрыемства. І яна дорыць і студэнтам, і выкладчыкам сапраўднае свята, непаўторную прыгажосць, за што гледачы кажуць ёй вялікі дзякуй сваім шчырымі ўсмешкамі і бурнымі апладысментамі. А гэта і ёсць самая вялікая ўзнагарода.

Наташына аднакурсніца Ганна падзялілася сваімі ўражаннямі пасля выступлення сваёй таленавітай сяброўкі:

— Такое не можа не ўразіць, нельга нават вачэй адвесці! Асабліва зачароўвае позірк, калі Наташа трымае дзвюх дзяўчынак, якія ў суме важаць прыкладна 110 кілаграмаў. Проста малайчына!

Я таксама не магу не згадзіцца з Ганнай: сапраўды малайчына.

...Дэвіз, з якім Наталля крочыць па жыцці: «Ісці да пастаўленай мэты і ніколі не здраджваць сябрам».

А пакуль галоўная мэта для Наташы — дастойна і паспяхова закончыць універсітэт і выбраць правільны шлях у далейшым жыцці.

Што ж, мне застаецца толькі пажадаць Наталлі здароўя, настойлівасці, удачы, высокіх дасягненняў на той жыццёвай дарозе, якую дзяўчынка сабе выбера. І мне вельмі хочацца, каб дарога гэта была сапраўды шчаслівай!

**Марына ФУНТ, студэнтка 4-га курса журфака БДУ.**

Дзякуй!

## АЛІСА... У КРАІНЕ ЦУДАЎ

У нашай сям'і 24 мая гэтага года нарадзілася другое дзіцятка — дачушка, якую мы назвалі Алісай. Нарадзілася яна вельмі маленечкай і кволай, важыла ўсяго 620 грамаў і страшна ўявіць, што магло б здарыцца, калі б побач не было сапраўдных прафесіяналаў...

А таму — нашы найшчырэйшыя словы ўдзячнасці загадчыку аддзялення рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі нованароджаных Мінскага абласнога раддома Сяргею Эдмундавічу Качану, урачам Марыяне Станіславаўне Рабавай, Аляксандру Барысавічу Сушчэўскаму, медыцынскай сястры Таццяне Баськовай. А таксама ўсяму персаналу педыятрычнага аддзялення неданошаных цэнтра «Маці і дзіця» — загадчыцы аддзялення Таццяне Мікалаеўне Дзіваковай, урачу Ліліі Віктараўне Зорынай, медсёстрам Ганне Іванаўне Дзянісавай, Ірыне Міхайлаўне Івановай, Паліне Сяргееўне Баслык, Алене Краснапёравай, Валянціне Міхайлаўне Біруля, Наталлі Міхайлаўне Петрашкевіч. Нізкі паклон вам, дарагія!

Мы заўсёды будзем памятаць вашу ўвагу, ваш клопат і добразычлівасць, дзякуючы якім наша сонейка, наша дзяўчынка цяпер з намі. Ёй ужо тры месяцы, яна падужэла і падрасла.

**Сям'я Касцяленяў.**

*в. Лучнікі, Слуцкі раён.*




# НЕ ПЕРАШКАДЖАЙЦЕ ДЗЕЦЯМ ЛЯТАЦЬ

**Пачатак навучальнага года — цудоўная пара, час радасці, эмацыянальнага ўздыму для большасці дзяцей. Надакучыла адпачываць, нічога не рабіць, засумавалі па сябрах — разам цікавей, весялей. Арганізм дзіцяці аднавіўся пасля летніх канікулаў і патрабуе дзейнасці, хочацца гуляць, весяліцца. Рухальная актыўнасць на пачатку навучальнага года ў малодшых і сярэдніх школьнікаў, як правіла, на высокім узроўні. Школа — гульня, сябры, радасць.**

Але чаму тады так часта гучаць словы «адаптацыя», «прафілактыка дэзадаптацыі да школы»? Да чаго адаптавацца? Да кантактаў, гульні? Новых уражанняў, новага вопыту? Да ўсяго гэтага дзіцячы арганізм натуральна адаптаваны дзякуючы прыродзе, ён гатовы да кантакту, да новых людзей, ведаў, развіцця. Тады да чаго адаптавацца? Адаптавацца трэба да сацыяльных умоў, правілаў: «ціха сядзець і ўважліва слухаць на ўроках», «не пазяхаць, не летуценіць, не лавіць мух» і г.д. Атрымліваецца ўжо не радасць, а абмежаванне, не гульня, а праца. А калі гульня? Пасля школы дамоў прыйшоў, паеў, зрабіў урокі, на трэніроўку схадзіў — і час спаць. «І так цэлы год», — уздыхаюць бацькі. Дзеці ж у сваю чаргу яшчэ не разумеюць, што ў дарослых няма паняцця — час на гульню, у іх жыцці ўсё сур'ёзна, адказна, абавязкова і дакладна паводле плана школьнай праграмы.

Як правіла, дарослыя з першых дзён вучобы спрабуюць арганізаваць рассеянае ўспрыманне дзіцяці «на яго ж карысць», зусім не падазраючы, што гэта марныя намаганні. Дзіцячы арганізм працуе выключна на сябе і прыйдзе да сацыяльнай нормы ў адпаведнасці са сваімі магчымасцямі і, што немалаважна, жаданнямі. Вось тут неабходна наша мудрае, непрыкметнае садзейнічанне, разуменне таго, што адбываецца, спроба прыняць натуральнае і патрэбнае для гарманічнага фарміравання псіхафізічнага развіцця дзіцяці. Будзьце ўважлівымі да сваіх дзяцей. Часам няярэблены ўрок можа дапамагчы пазбегнуць эмацыянальных перагрузак і як следства — негатыўных адносінаў да школы. А мы: «Адпачыў? Цяпер за працу!», «у школе трэба вучыцца, а не гуляць!» Яшчэ адзін прыклад «актыўнай падтрымкі» настаўніка на ўроку: «Дзеці, вы мяне расчаравалі сваімі адзнакамі...» (прыклад пасля другога ўрока ад пачатку навучальнага года). Бліснее ў вачах дзіцяці праменьчык радасці ад слова «школа» і пагасне. Хто пастараўся?

Арганізм маленькага чалавека трох, ці сямі, ці дзесяці гадоў вельмі цудоўна ўладкаваны. Ён з апошніх сіл, незалежна ад часта негатыўнага ўплыву сацыяльнага асяроддзя з яго абмежаваннямі і правіламі, спрабуе быць шчаслівым і радавацца новаму дню: сонейку, якое грэе, дожджыку, пад якім можна пагуляць.

Псіхіка дзіцяці да пэўнага ўзросту вызвалена ад такога паняцця, як аналіз, нездарма. Трэба паспець назапасіць адчуванні шчасця і радасці, якія потым несці па жыцці доўга. Адсутнасць умення аналізаваць у дзяцей да 12 гадоў абумоўлена незалежнай працай правага і левага паўшар'яў кары галаўнога мозга. Аналізаваць і знаходзіць прычынна-выніковыя сувязі дзіця навучыцца ў перыяд падлеткавага развіцця. Адсутнасць здольнасці аналізаваць у дзяцей да названага ўзросту спецыялісты называюць тэрмінам «няма сумлення». Прырода так мудра ўладкавала дзіцячы арганізм, пазбавіўшы яго пачуцця віны, каб даць магчымасць дзіцячай псіхіцы памацнець, абараніўшы яе ад асуджэнняў і непасільных крыўдаў. На жаль, спецыфіка нашай педагогікі мае на ўвазе наяўнасць усіх асобасных характарыстык дарослага чалавека ў школьніка пачатковага і сярэдняга звяна. Што ж казаць аб падлеткава-юнацкім узросце, дзе ты проста абавязаны быць адказным, сур'ёзным, валявым, г. зн. правільным! І што далей? Маленькія людзі хочуць лятаць, а дарослыя пастаянна іх пераконваюць, што чалавек лятаць не ўмее!!! Ці заўсёды дарослыя маюць рацыю?

Мы любім паўтараць словы кшталту «адаптацыя», «дэпрэсія», «дысацыяльны», часта зусім не падазраючы аб сапраўдным іх значэнні. У сапраўднасці дэзадаптацыя ў пачатковым і сярэднім школьным узросце, гэты вынік нашага няпоспеху, мае сур'ёзныя наступствы для фарміравання псіхікі дзіцяці. Гэта азначае, што дзіця па нейкай прычыне засталося адно. Сам-насам з гэтым цудоўным, незразумелым светам, у якім ёсць правілы, а яно іх парушыла. Няцяжка здагадацца, па якой прычыне — проста яно спрабавала лятаць...

Асуджэнне — звыклы метад выхавання, спадчына мінулага стагоддзя. «Не разумею» — значыць «не прымаю». Але хто даў права асуджаць? Мы самі сабе далі гэта права, так нас выхоўвалі, так выхоўваем і мы, але тады не чакайце жаданага прагрэсу, будучыня за імі, іншымі, не такімі, як мы. Ім патрэбны нашы дапамога, падтрымка і адабрэнне. Не бывае лянівых дзяцей, — бываюць лянівыя бацькі, дарослыя, якія не хочуць мяняцца і ўспрымаць змяненні, што адбываюцца навокал. Не хочуць бачыць, што нашы дзеці бываюць больш разумныя і мудрыя за нас, таму што іх вядзе інстынкт, дадзены прыродай, мудрасць усёй зямлі. Гэтыя змяненні не спыніць, важна толькі тое, колькі будзе такіх дзяцей — здаровых, шчаслівых і моцных і што мы зрабілі для таго, каб падтрымаць хоць бы аднаго, які ловіць мух, грызе пазногці, не слухаецца і наогул, ніяк не хоча стаць «прыстойным чалавекам».

Паважаныя дарослыя, калі вы развучыліся лятаць, не перашкаджайце гэта рабіць іншым! Вось і ўся адаптацыя да школы.

**Ваша Святлана АНІШЧАНКАВА.**

# Сёлета ў летніках маглі адпачываць 17-гадовыя



**Падведзены вынікі летняй дзіцячай аздараўленчай кампаніі 2007 года. Як адзначыў намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню насельніцтва Генадзь Балбатоўскі, на аздараўленчую кампанію дзяржавай было выдзелена 57,3 млрд рублёў, на падрыхтоўку матэрыяльна-тэхнічнай базы — 1 млрд руб.**

Усяго адпачыла і паправіла сваё здароўе больш як 455 тысяч дзяцей. У краіне сёлета працавала 208 летнікаў кругласутачнага знаходжання, больш як 3,5 тысячы лагераў з дзённым знаходжаннем, таксама 42 аздараўленчыя лагеры на базе санаторна-курортных устаноў. Таксама па ініцыятыве МУС, Міністэрства абароны, МНС былі створаны профільныя лагеры, дзе адпачывалі групы сацыяльна неабароненых падлеткаў.

Дзяржавай была вызначана сума дзярждатацыі за пуцёўкі. Напрыклад, у кругласутачных лагерах яна складала 185 тыс. руб. пры планавым кошце 360 тыс. руб. Бацькоўская даплата складала каля 10 працэнтаў, астатні кошт кампенсаваўся прафсаюзнымі арганізацыямі, мясцовымі ўладамі і г.д. У дзённы лагер пуцёўка каштавала 81 тыс. руб., датацыя на яе складала 70 тыс. руб. Кошт адпачынку ў профільным лагеры — 105 тыс. руб., дзяржаўная датацыя — 80 тыс. руб.

У гэтым годзе быў зменены ўзроставы цэнз дзяцей, якія накіроўваліся на адпачынак у лагеры. Раней самым старэйшым выхаванцам летнікаў павінна было быць не больш як 16 гадоў. Сёлета ўжо 17-гадовыя падлеткі маглі адпачыць у летніх лагерах. Падчас аздараўленчай кампаніі-2007 былі павялічаны штаты супрацоўнікаў дзіцячых устаноў адпачынку. Таксама ў бок паляпшэння перагледжаны нормы харчавання. Напрыклад, у кругласутачным лагеры на дзень сума на харчаванне для дзяцей малодшай катэгорыі (ад 6 да 10 гадоў) складала 4 640 руб., для старэйшай (14—17 гадоў) — 5 390 руб.

У гэтым годзе, заўважыў Г. Балбатоўскі, было адзначана каля 13 тысяч выпадкаў захворвання дзяцей у летніх лагерах, пераважна хлопчыкі і дзяўчынкі хварэлі на ВРЗ. Аднак у параўнанні з мінулым годам колькасць захварэлых знізілася, як скарацілася і колькасць траўмаў у дзяцей падчас адпачынку ў летніках.

**Вольга ШАЎКО.**

Народны каляндар


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# У ШЧОДРАГА НАРОДА І СВЯТЫ БАГАТЫЯ!

**Народная мудрасць, занатаваная ў традыцыйным календары беларусаў, дакладна адлюстроўвала не толькі змены ў прыродзе і адпаведныя ім падзеі ў жыцці земляроба, але яшчэ і невычарпальны патэнцыял абрадаў і песеннай спадчыны, паданняў і легендаў, мудраслоўяў, якія па-свойму асэнсоўвалі месца чалавека ў прыродзе і ролю прыроды ў захаванні чалавечага роду.**

Гарманічна ўпарадкаваны каляндар беларусаў — гэта тая ўніверсальная энцыклапедыя, якая знітавала ў сабе дзве плыні жыццядзейнасці народа: з аднаго боку, яго карпатлівую працу дзеля таго, каб з годнасцю гаспадаром можна было звацца, а з другога — неабсяжны духоўны вопыт, які вучыў вырывацца з вярыгаў паўсядзённасці і з рытмічнай паслядоўнасцю ладзіць агульнавясковыя, а то і рэгіянальныя фэсты. Кожнае свята было не проста чарговай падставай сабрацца, адпачыць, выпіць келіх медавухі і падзяліцца апошнімі навінамі. Перш за ўсё гэта — свяшчэнны акт, які фіксаваў заканчэнне аднаго этапу жыцця і абрадавае праграмаванне другога, наступнага ў бясконцым колазвароце дзён, месяцаў і гадоў.

> **У дзень святкавання Багача ўсе вяскоўцы імкнуліся перасцерагчы сваё жытло і саміх сябе ад нястачы і хвароб**

Асаблівасцю народнага светасузірання, адлюстраванай у календары, было прамое параўнанне жыцця чалавека з прыродным гадавым цыклам. Вясновы сегмент календара адлюстроўваў нараджэнне года, паэтапнае абуджэнне прыроды і зачацце Маці-зямлі новым ураджаем. Кожны чарговы этап на гэтым шляху атрымліваў міфапаэтычнае асэнсаванне і суправаджаўся шэрагам прыкмет, рэгламентацый і прадпісанняў, якія мы называем залатымі правіламі народнай культуры. Да іх можна аднесці дзень прылёту буслоў, дзень, калі падала свой незвычайны голас вяшчунка-зязюля. Асаблівае значэнне надавалася паслядоўным этапам адмыкання зямлі. Распачынаў гэты ланцужок той дзень, калі першы раз прагрымеў гром — з зямлі пачыналі выпаўзаць усялякія вужакі і гадзюкі. Радаўніцай распачынаўся вялікі цыкл земляробчых работ, нарэшце, Юр'е выпускала на свет Божы гаючую расу. Веснавая мадэль разгортвання сялянскага Космасу будзе цалкам паўторана (толькі ў парадку люстэркавай зваротнасці) у восеньскай традыцыі трохэтапнага згортвання земляробчых спраў і «замыкання» зямлі-карміцелькі. Уздзвіжанне пакліча ўсялякіх гадаў у падземны вырай, Пакровы засцелюць зямлю бялюткім покрывам нябеснай святасці, а Восеньскія Дзяды аддзячаць продкаў — уладароў зямлі — за дапамогу-спрыянне ўзгадаванню багатага ўраджаю.

Аднак усяму гэтаму працягламу і шматэтапнаму цыклу падзей будзе папярэднічаць свята, сэнс якога, на наш погляд, далёка не асэнсаваны, а духоўны патэнцыял толькі ў нейкай ступені выкарыстаны ў складаным працэсе фарміравання сучаснай ідэалогіі нашай дзяржавы.

Яшчэ раз звернемся да логікі традыцыйнага календара. На Рдаўніцу навялі парадак на могілках, атрымалі ціхае благаслаўленне продкаў, распачалі сяўбу, узгадавалі доўгачаканы ўраджай, згуртаваліся вакол жніва, а пасля таго, як сабралі ўсё ўзгадаванае, то сталі багатымі. Менавіта таму 21 верасня (некалі гэта быў дзень восеньскага раўнадзенства) на Беларусі адзначалі свята-мрою, свята-надзею, **свята падзякі Прыродзе і Продкам за дапамогу, свята з выключна ўдалай, філасофска-абагульняльнай назвай — БАГАЧ.** Вось яна — адвечная ідэя нашых далёкіх і блізкіх продкаў, ідэя, якая застаецца самай актуальнай і для нашых сучаснікаў. Будзе багатым чалавек, сям'я, род — будзе багатым і разняволеным і ўвесь народ. Зразумела, што кожнае свята традыцыйнага календара беларусаў мела свае абрадавыя дзеянні, якія і ўвасаблялі асноўную ідэю калектыўнага фэсту. У гэты дзень выконваўся цікавы рытуал абходу вёскі.

Бралася вялікае рэшата, у яго насыпалі зерне асноўных для Беларусі збожжавых культур: жыта, аўса, ячменю, пшаніцы, грэчкі. У сярэдзіну ставілі вялікую грамнічную свечку, запальвалі яе, і ганаровая працэсія (у якую ўваходзілі святар, гаспадар, які сабраў найбольшы ўраджай, а таксама той вясковец, які захоўваў такую лубку з зернем на працягу мінулага года) паціху ішла па вёсцы, спыняючыся каля кожнага падворка. Пачэсную грамаду з задавальненнем сустракалі гаспадары кожнай вясковай хаты. Перад варотамі ставілі стол, засланы чыстым абрусам, на якім гарой мясціліся дары зямлі і самыя вытанчаныя прысмакі гаспадыні. Кожны гаспадар, каля хаты якога спынялася святочная грамада, сыпаў у рэшата жменю зерня са свайго поля, а гаспадыня шчыра частавала ўдзельнікаў абрадавага абходу.

Вядомы беларускі фалькларыст А. Багдановіч, бацька зоркі нашай паэзіі М. Багдановіча, пакінуў цікавае апісанне яшчэ аднаго варыянту выканання калектыўнага абраду. Ён засведчыў, што пасля непрацяглага малебна лубка з жытам рушыла па вуліцы ў суправаджэнні ўсіх жыхароў вёскі. Пасля гэтага гаспадыні выганялі свойскую жывёлу ў поле, а святар разам з пастухом тройчы абходзілі статак. Затым рэшата, напоўненае зернем, неслі да той хаты, у якой гэты сімвал дабрабыту, спагады, узаемадапамогі, своеасаблівай гарантыі ўдачы і максімальнага спрыяння будзе захоўвацца на працягу наступнага года. Вясной жа той гаспадар першым выйдзе ў поле і распачне засеўкі. Такім чынам, мы сталі сведкамі абраду калектыўнай узаемападзякі і ўзаемападтрымкі, ганаравання чалавека працы, асвячэння зерня новага ўраджаю. Адначасова была рэалізавана ідэя першапачатковага «замыкання» асвоенай прасторы вёскі на працяглы перыяд зімовага спачыну зямлі.

Відаць, зусім сімвалічным з'яўляецца тое, што ў дзень святкавання Багача ўсе вяскоўцы імкнуліся перасцерагчы сваё жытло і саміх сябе ад нястачы і хвароб з дапамогай незвычайнага абярэга. Людзі зразалі па некалькі гронак чырвонай рабіны, прыносілі іх у хату, станавіліся перад абразамі ў чырвоным куце, шапталі словы спецыяльнай замовы і малітвы і клалі іх ці то за абразы, паміж здвоенымі рамамі на зімовы перыяд, ці то ў калыску дзіцяці. На Беларусі рабіна лічылася свяшчэнным дрэвам, у значнай ступені звязаным з культам Багародзіцы.

З пашырэннем хрысціянства якраз **у гэты дзень пачало святкавацца Раство Багародзіцы, або Другая Прачыстая.**

**Аксана КАТОВІЧ,**
**Янка КРУК.**

# ДЗЕНЬ восеньскага раўнадзенства — кропка адплаты за даўгі

**Яшчэ не сышоў летні загар, яшчэ не ўсе дарожныя чамаданы распакаваныя, не ўсе турыстычныя байкі расказаныя, а ў дзверы ўжо грукае восень.**

23 верасня дзень зраўняецца з ноччу (надыдзе дзень восеньскага раўнадзенства). Як растлумачыў нашаму карэспандэнту **дырэктар Абсерваторыі БДУ, кандыдат фізіка-матэматычных навук Альгерд КУЗНЕЧЫК,** сёлета астранамічная восень (калі сонца пяройдзе з паўночнага паўшар'я ў паўднёвае) пачнецца ў 12 гадзін 51,2 хвіліны. Сонца вернецца да нас у паўночнае паўшар'е ў дзень веснавога раўнадзенства. Астранамічная восень зменіцца астранамічнай зімой 22 снежня (дзень зімовага сонцастаяння) у 8 гадзін 07,8 хвіліны.

Яшчэ да новай эры людзі старажытных цывілізацый вылучалі чатыры асобыя дні года: зімовага і летняга сонцастаяння, веснавога і восеньскага раўнадзенства.

— Іх называюць кардынальнымі кропкамі задыяка, — патлумачыў **астролаг Уладзімір ВАСЮК.** — Дзень веснавога раўнадзенства святкаваўся як пачатак года. З гэтага дня энергетыка ішла на ўздым, прырода, людзі, усё жывое «накаплівала вопыт» (расліны фарміравалі плады, жывёлы пладзіліся, людзі перажывалі пэўныя падзеі).

Кожны актыўна праяўляў сябе. З надыходам дня восеньскага раўнадзенства наступае перыяд, калі кожная істота ў паўночным паўшар'і пачынае гэты вопыт «асэнсоўваць», «сістэматызаваць». У старажытнасці на дзень восеньскага раўнадзенства прыпадала свята Багач. Аналагічнае свята ўраджаю захавалася ў многіх народаў і сёння. Увогуле, гэта час, калі чалавек павінен падвесці высновы, усвядоміць пройдзены шлях, задумацца, як ён будзе ў далейшым рэалізоўваць па жыцці прынцып адказнасці (за сябе, сваю сям'ю і г.д.) — у гэтым глыбокі сэнс кропкі восеньскага раўнадзенства.

Звычайна 22—23 верасня шэраг планет і сонца праходзяць кропку, якую астролагі называюць «супергалактычны цэнтр». Звычайна ў гэты перыяд адбываюцца вельмі сур'ёзныя, глабальныя змены ў палітыцы, эканоміцы, на фондавых біржах, асэнсаваць якія атрымліваецца праз некалькі месяцаў.

Увогуле, у кардынальных кропках задыяка адбываецца прамое ўмяшанне «нябеснай канцылярыі» ў жыццё людзей. Спачатку яно непрыкметнае, а з цягам часу перамены становяцца ўсё глыбейшымі, таму ў кропцы восеньскага раўнадзенства трэба назіраць — за сабой, за падзеямі. Гэтую кропку яшчэ называюць кропкай адплаты за даўгі: кожны атрымае тое, што заслугоўвае. Таму ў гэты перыяд варта прааналізаваць атрыманае (ці неатрыманае) і скаардынаваць у сувязі з гэтым сваё далейшае жыццё.

**Запісала**
**Інга МІНДАЛЁВА.**

## Сёння

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.52 | 19.12 | 12.20 |
| Віцебск — | 6.41 | 19.02 | 12.21 |
| Магілёў — | 6.42 | 19.02 | 12.25 |
| Гомель — | 6.39 | 18.58 | 12.19 |
| Гродна — | 7.08 | 19.27 | 12.19 |
| Брэст — | 7.09 | 19.28 | 12.19 |

**Месяц**

***Першая квадра 19 верасня. Месяц у сузор'і Казярога.***

**Імяніны**

*Пр. МАЛАЯ ПРАЧЫСТАЯ (НАРАДЖЭННЕ МАЦІ БОЖАЙ); К. Аляксандра, Ваўжынца, Іпаліта, Мацея.*

## Надвор'е на заўтра




## ...у суседзяў

| | | | |
|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +19 — +21 °С | МАСКВА | +15 — +17 °С |
| ВІЛЬНЮС | +17 — +19 °С | РЫГА | +18 — +20 °С |
| КІЕЎ | +17 — +19 °С | С-ПЕЦЯРБУРГ | +16 — +18 °С |

## 21 верасня

Дзве даты

**1916 год** — у горадзе Себеж пад Віцебскам нарадзіўся Зіновій Яўхімавіч Герд, выдатны савецкі акцёр («Залатое цяля», «12 крэслаў», «Саламяны капялюш»), народны артыст СССР.



**862 год** — наўгародцы запрасілі на княжанне братоў-варагаў Рурыка, Сінеуса і Труора. Гэты год лічыўся пачаткам рускай дзяржавы.

Цытата дня:

***«Вялікі чалавек бярэцца за вялікія справы, таму што ўсведамляе іх веліч; дурны — таму што не разумее, наколькі яны цяжкія».***

**Люк Вавенарг (1715—1747), французскі пісьменнік.**

## Усміхнёмся!

*Курорт. Мужчына на пляжы звяртаецца да выратавальніка:*

*— Скажыце, вы не маглі б мне парэкамендаваць самую яркую і незвычайную дзяўчыну на пляжы?*

*Выратавальнік (у мегафон):*

*— Дзяўчына з гіпсам у жоўтым купальніку 62-га памеру на гідрацыкле! Вас чакаюць каля вышкі выратавальнікаў!!!*

☺

**Дрэнна працаваць у жаночым калектыве. Ні пра футбол пагаварыць, ні пра жанчын...**

☺

*— Сынок, не хадзіў бы ты па гэтых дыскатэках — аглухнеш!*

*— Дзякуй, мама, я паснедаў!!!*

☺

**Набывайце на кніжных паліцах краіны бестселер «Чаго хочуць жанчыны»! У канцы кнігі вы знойдзеце прайс-дадатак «Колькі гэта каштуе»!**

☺

*— Што робіць хакер, каб узламаць банк?*

*— Бярэ ноўтбук і малаток, падыходзіць да банкамата, разбівае яго малатком, забірае грошы і ўцякае.*

*— А навошта яму тады ноўтбук?*

*— А які ж хакер без ноўтбука?*

☺

**Падаюць зоркі. Зяць з цёшчай загадваюць жаданні. Зяць загадаў. А вось цешча не паспела...**

**У суд Барысаўскага раёна Мінскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні памерлым **Скрыпко Віктара Іванавіча,** 8 сакавіка 1951 года нараджэння, ураджэнца г. Барысава Мінскай вобласці, які пражываў у Барысаве на вул. Стаханаўскай, д. 41-а і выехаў на працу ў г. Усурыйск. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Скрыпко В.І., паведаміць іх суду Барысаўскага раёна Мінскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Простыя рэчы

**У нас, на Віцебшчыне, менавіта капешка — невялікая гурбачка ў асноўным сена. На яе можна ўскочыць з разгону нават у дзіцячым узросце. І няважна, што яна разбурыцца, верх яе паваліцца долу — бацькі потым падымуць віламі. Паправяць. А ў цябе ж асалода і ад скоку, і ад паху сена, якое яшчэ не пакінула лугавіну, толькі-толькі сабранае ў капешачкі, не перацёртае, калі не было дажджоў — нават зялёнае. Капешачкі такія складаліся ў нас на першы час. Каб толькі падабраць сена з сенакосу, скласці яго, сухое, — няхай чакае воза. Потым конік няспешна пацягне гэты набытак ужо пад страху. І тут успомнілася. Нават сам здзівіўся і перазваніў паэту, каб дакладна прывесці яго радкі. Некалі Алесь Жыгуноў надрукаваў пранізлівае:**

*Апошні воз дакошанага лета*
*Завозіць восень у бацькоўскі двор.*
*Суцішылася ў роздуме планета,*
*Глядзіць вачамі яблыкаў і зор.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Капешка, капешачка — гэта сярэдзіна, а то і заканчэнне лета (наколькі дазваляла надвор'е правесці сенакашэнне і адпаведную ўборку травы). У дажджлівае надвор'е на нашай Віцебшчыне капешкі стаяць на лугавінах, па садах, па лясных палянах досыць доўга. Іх даводзіцца не раз растрасаць для прасушкі, нярэдка накрываць цэлафанавымі плёнкамі, калі прыходзіць залева.

Ды толькі ў літаратурным ужытку наша мясцовая капешка ператвараецца ў капу агульнабеларускага ўжытку. Але капа і ў нас, і ўвогуле на Беларусі мела некалькі значэнняў. Некалі яна ў Вялікім княстве Літоўскім была нават грашовай мерай, што раўнялася 60 літоўскім грошам. Гэта быў і сход сялян у той жа час Вялікага княства Літоўскага, дзе вырашаліся судовыя справы, зямельныя спрэчкі. Капой называліся і 60 снапоў збожжа. І нават нешта іншае, сельскагаспадарчае, лічылася таксама на копы. У Анатоля Вялюгіна:

*Гуркоў па сто дванаццаць коп*
*Узята з кожнай градкі.*

Але капой найперш у нядаўнія яшчэ часы быў ды і цяпер ёсць невялікі стажок сена, саломы... А ў калгасныя часы для таго, каб зцягнуць і вывезці копы сена, напрыклад, выкарыстоўваліся капавозы. Цяпер іх замянілі пагрузчыкі, так званыя стогакіды. Але перад тым як павесці гаворку аб стагах, спынімся крыху на вельмі цікавым корані ў нашай мове — «капа». Зразумела, што капец — ад гэтага кораня. Гэта можа быць і капец буракоў, бульбы — нейкае ўзвышэнне над зямлёй. Але ж і капец для азначэння нейкага знака, мяжы. У майго любімага Якуба Коласа:

*Але праведзена граніца,*
*На ёй пастаўлены капец,*
*Парог паложаны — канец.*

А таксама і насып над магілай. У нашай мясцовасці ў гэтым значэнні слова мала выкарыстоўваецца, але гэта літаратурная норма. Ніл Гілевіч:

*Над гэтым салдацкім капцом*
*дарагім*
*Прашу аднагодкаў: праверце,*
*Ці не зараслі дзе да родных магіл*
*Сцяжыны — у полі і ў сэрцы!*

Адсюль, напэўна, і размоўнае «капец» — калі гавораць пра заканчэнне жыцця чалавека.

Ну а наступным у нашым аповедзе будзе — стог. Гэта ўжо вялікая капа сена, саломы, якую ставяць калектыўна, талакой. Яны вялікія па памерах. Нездарма існуе выслоўе: як іголка ў стозе сена. Такія стагі можна было і не ўбіраць з сенажацяў, пакідаць іх на зіму. Называліся яны яшчэ сціртамі. Сцірта звычайна была больш важкай, добра ўпарадкаванай, у кінафільмах пра даўнейшае калгаснае жыццё можна нярэдка пабачыць, як менавіта ў сцірты вяскоўцы збіраюць сена. І абавязкова надыходзіць дождж. Не зусім праўдзіва гэта паказвалася: людзі мітусяцца, таўкуцца. Між тым у вёсцы існавала спецыяльная прафесія сціртавальшчыка ці сціртавальшчыцы — людзі, якія ўмеюць і ведаюць як іх укладваць. А зімою сцірты вывозіліся да калгасных фермаў на санях, потым на трактарах. Па першым часе ў калгасах проста не хапала памяшканняў для захоўвання сена. А вось у аднаасобнай гаспадарцы леснікоў з «Новай зямлі» Якуба Коласа ў святочную часіну гаспадары якраз і аглядаюць тое, што назапашана пад страхой, — збажына, сена. Яны паклапаціліся аб тым, каб усё было схаванае ад дажджу, ад непагоды. А ў калектывіста свайго часу Анатоля Астрэйкі інакш:

*Вось збяром мы травы*
*Сонечнымі днямі*
*І лугі заставім*
*Свежымі стагамі.*

Ды толькі, прызнаюся, у беларускай паэзіі, мяне найперш вабіць яе лірычнасць, непаўторны погляд на прыроду роднага краю, а не сацыяльныя моманты. Ну, і як не працытаваць Пімена Панчанку:

*Смех і кветкі,*
*вы куды падзеліся?*
*Навакол стагі, стагі, стагі.*
*Чым жа ты цяпер*
*са мной падзелішся,*
*Прыпяць, пачарнелая з тугі...*

Стог не абыходзіўся без стажара — гэта ўваткнуты ў зямлю шост, вакол якога і ўзводзіўся стог. Гэты шост нібы аб'ядноўваў, прыцягваў да сябе сена, салому, рабіў стог трывалым. Пад ім было стажар'е, подсцілка з чаго-небудзь, напрыклад, з яловых лапак, на якую ашчадны гаспадар пачынаў класці сена ці салому, каб не сапсавалася. А вось калі сена ці салома ўбіраліся, заставалася толькі гэта подсцілка, то, на мой погляд, а такое слова існуе, гэта ўжо вясной было стажарышча. А давайце ўспомнім. У нашай жа роднай мове ёсць і назва Стажары — гэта група блізка размешчаных зорак у сузор'і Цяльца. Таксама ахутваюцца, ціснуцца адзін да аднаго, як тое сена. Спецыяльна паглядзеў у рускамоўны тлумачальны слоўнік — не, і там ёсць «стожары», значыць, назва агульнаславянская. У рускай мове «стожар» — гэта яшчэ і кол. Але ж у нас ёсць Колас:

*Ночкай вынікнуць стажары,*
*І бяздонныя амшары*
*Зоркі высцелюць руном.*

Ці даводзілася вам калі заначавацца ў стозе сена ці саломы? Відаць, не кожнаму. Увогуле, аматарам накрухмаленых прасцін, асабліва жанчынам, я гэтага і не раіў бы. А тэхналогія тут даволі простая: выскуб сабе норму па памеру свайго цела, схаваўся ад восеньскага дажджу ці нават ад зімовай завеі, заткнуў уваход не надта шчыльна, каб паветра праходзіла, і драмі сабе, удыхай пахі лета, жнівеньскай пары. Раніцою папраў сваю нару і — кроч у шуканні шляху, які згубіў надвячоркам. Для курцоў толькі адно папярэджанне: ну, пацярпіце вы там з куравам, а то праца многіх людзей пойдзе прахам. Гэты прытулак даўно вядомы людзям. Старыя вяскоўцы расказвалі, што ў час вайны, пры нямецкіх аблавах карнікі вельмі часта абстрэльвалі стагі, палілі іх — там любілі заначаваць партызаны. Вось знайшоў у Міколы Баранавых: «Коссцік зрабіў нару ў стозе сена на Белай градзе і там начуе. З «ненаглядной певуньей в стогу ночевал» у героя адной з песень акцёра і паэта Міхаіла Ножкіна. Але сучасным аматарам экстрыму параю: не лезьце, там, акрамя заўсёднай пацярухі, ёсць яшчэ і насякомыя, і нешта больш непрыемнае. Ды і заначаваць вам сёння наўрад ці ўдасца. Бо сёння стагоў у полі цяжка знайсці. Калі і стаяць, то торпы саломы. А складаюцца яны з вялікіх рулонаў, скручаных на ржышчы спецыяльнай машынай, і ніяк ты іх не развяжаш. Падобнымі ж машынамі скручваецца ў рулоны і льнотраста, якая адвозіцца потым на льнозавод, дзе ўкладваецца ў вялізныя, з трохпавярховы будынак, торпы. На пачатку працоўнага шляху мне даводзілася ўкладваць такія торпы, праўда, тады яшчэ з ільняных снапоў.

Але гэта іншая размова. Мы пачалі з капешачкі, ёю і завершым. Цяпер, калі бываю ў вёсачках і вёсках і бачу, што стаяць ля азяркоў і рэчачак капешкі сена, а то пераплоты, азяроды з жэрдачак з навешаным на іх сенам — сэрца цешыцца, значыць, жывуць людзі, трымаецца і кароўка.

**Алесь КАСЦЕНЬ.**

*Вёска Касцяні Пастаўскага раёна.*

Крымінал, здарэнні

## ТРАГЕДЫЯ ПАСЛЯ ЖАЛОБНАГА СТАЛА

**Тры чалавекі сталі ахвярамі агню ў Бярэзінскім раёне ў вёсцы Ягодка. Трагедыя ў адной з сем'яў разыгрывалася на працягу апошніх двух тыдняў.**

Напачатку ў бальніцу ў коме трапіла гаспадыня збітая дома ў п'янай кампаніі. Пад арышт трапіў і сын пацярпелай. У выніку траўмаў жанчына памерла. На пахаванне пенсіянеркі сабралася радня. А ноччу суседка ўбачыла языкі полымя на даху дома. Пасля жалобнага стала ў ім засталіся начаваць другі сын памерлай са сваёй жонкай, якія жылі ў суседняй вёсцы, і сваяк жанчыны. Найбольш верагоднай прычынай здарэння стала цыгарэта, ад якой каля апоўначы і пачаўся пажар. Падраздзяленні МНС, прыбыўшы ў вёску, знайшлі ўсіх траіх ужо памерлымі. Сітуацыю, відавочна, ускладніла ўжыванне спіртнога напярэдадні, бо сын і нявестка гаспадыні, як мяркуецца, прачнуліся, аднак выбрацца з задымленага памяшкання ўжо не змаглі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АТРУЦІЎСЯ НАСТОЙКАЙ ЛАМІНАРЫІ

**У Віцебскую абласную клінічную бальніцу брыгада хуткай медыцынскай дапамогі з прыпынку грамадскага транспарту «Плошча Свабоды» прывезла мужчыну ў стане комы.**

Як адзначылі «Звяздзе» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, медыкі ў ліку іншага паставілі і такі дыягназ: атручванне настойкай ламінарыі. Зараз невядомы мужчына, якому на выгляд гадоў 40, знаходзіцца ў рэанімацыйным аддзяленні.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЗАБАЎЛЯЎСЯ З РУЖЖОМ

**11-класнік з вёскі Альшаны, што ў Столінскім раёне, каля гадзіны пуляў з незарэгістраванага паляўнічага ружжа па дарожных знаках.**

Хуліган практыкаваўся на трапнасць на дарозе Альшаны—Малешава, а зброю, як высветлілася, «пазычыў» у бацькі. Стралок з юнака атрымаўся яшчэ той: школьніку ўдалося пашкодзіць 7 дарожных знакаў. Праваахоўнікі завялі крымінальную справу, а ружжо канфіскавалі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# ПЯТНІЦА, 28 ВЕРАСНЯ

**6.00, 16.45 Серыял «Права на шчасце».**
**6.50, 0.50** Дзень спорту.
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 9.05** Прэс-агляд.
**7.10, 8.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.25, 8.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**7.45, 8.45** Зона Х.
**8.20** Гатуем разам!
**9.10, 19.55 Серыял «Група Zэта».**
**10.00** Сфера інтарэсаў.
**10.25, 17.45 Серыял «Каханне як каханне».**
**11.25** Дак. серыял «Архітэктурныя шэдэўры».
**12.10 Камедыя «Прыватны дэтэктыў, або Аперацыя «Кааперацыя».**
**14.00** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**14.45** Nota Bene.
**15.15, 19.25** Навіны рэгіёна.
**15.30, 1.00 Серыял «Камедыйны кактэйль».**
**19.35** Зона Х.
**21.00** Панарама.
**21.45 Трылер «Чым заняцца мерцвяку ў Дэнверы».**
*Быў у Джымі легальны бізнэс — запісваць на відэаплёнку парады людзей і паказваць іх родным пасля таго, як яны памруць.*
**23.50** Фігуры.
**2.05** Вось дык шоў!

**6.00, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 3.00** Нашы навіны.
**6.05, 15.00** «Laліта. Без комплексаў».
**7.05** «Наша раніца».
**9.05 «Таццянін дзень». Серыял.**
**10.00** «Модны прыгавор».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25** Навіны спорту.
**11.10** «Гэтыя цудоўныя жывёлы». Дак. серыял.
**12.00** «Малахаў+».
**13.10 Серыял «Мая цудоўная няня».**
**13.40** «Федэральны суддзя».
**14.30** «Кантрольная закупка».
**16.15 Серыял «Супермаркет».**
**17.15** «Няхай гавораць».
**18.20** «Злачынствы стагоддзя».
**18.55** Поле цудаў.
**20.00** Час.
**21.05** «Сярэбраны грамафон. Суперфінал».
**23.30 Трылер «Доўгі пацалунак нанач».**
**2.10 Камедыя «Шырлі-мырлі».**
**4.55** Дэтэктывы.
**5.20 Маст. фільм «Калегі».**

**7.00** Ранішняя падзарадка.
**8.00, 17.30 Серыял «Беліндa».**
**8.50** Дак. серыял «Сакрэты старажытных камянёў». «Фівы на берагах вечнасці».
**9.45** Ядзім дома.
**10.15** У гэты дзень.
**10.20 Меладрама «Сцяпан Сяргеіч». 2-я серыя.**
**11.35** Мультфільм.
**11.55, 18.30 Серыял «Расплата за грахі».**
**12.45** «Анекдот. LAD».
**13.10, 21.40 Серыял «Свой чалавек».**
**14.05** «Алімпійская гісторыя». Атланта 1996 г.
**15.00** «Спорт, спорт, спорт...». Мікалай Кіраў.
**15.30** Дак. серыял «Паляўнічая адысея».
**15.55** Мультсерыял «Добрай раніцы, Мікі Маўс!».
**16.30 Серыял «Школа першых ракетак».**
**16.50** Усё аб бяспецы.
**19.30** Беларуская часінка.
**20.35** Калыханка.
**20.55** Правы чалавека.
**21.10** «Цудоўная сямёрка». Эпізод першы.
**23.30 Трылер «Пракляты востраў».**

**6.05, 17.20** «Міншчына».
**6.15, 7.40** «З чаго пачынаецца раніца».
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**8.40** «Аўтапанарама».
**9.00** «Салдаты. Навыварат». Фільм аб серыяле.
**10.00** «Сталкер».
**10.40** «Тэма дня».
**10.45** «Наша справа».
**11.00, 18.25 «За ўсё табе дзякую 2». Серыял.**
**12.00 «Гульня без правілаў». Серыял. Заключная серыя.**
**13.00** «Асабісты інтарэс».
**13.50 Маст. фільм «Ціхія троечнікі».**
**14.55** «Іншапланецяне». Мультсерыял.
**15.15** «Надзвычайныя гісторыі».
**16.00** «Ёсць кантакт».
**16.50** «Бабскі бунт». Ток-шоў.
**17.30** «Званая вячэра».
**20.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, малыш».
**20.30 Камедыя «Брыс цудоўны».**
**22.55** «Відзьма-нявідзьма».
**23.30** «Бла-бла-шоў».
**0.10 Баявік «Раптоўны ўдар».**
**1.35 «Уцёкі». Серыял.**

**4.00, 5.00, 6.00, 7.00** Заражджайся!
**4.30, 14.00 Серыял «Маўглі».**
**5.30** За сталом з Бертам Волфам.
**6.30** Удачная пакупка.
**7.30 Серыял «На віражы».**
**8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30** «Навіны Садружнасці».
**8.45** Арт-рэвалюцыя.
**9.00** Даведнік.
**9.30** «Спрэчная тэрыторыя».
**10.30 Серыял «Раксалана».**
**12.00** Студыя 60х90.
**12.15, 22.30 Маст. фільм «Жывыя легенды».**
**13.45** Урокі англійскай мовы.
**15.00** Сливки общества.
**16.00** Парад парадаў.
**17.00** Вясельныя вар'яцтвы.
**17.55** Дзелавы тыдзень.
**18.15** «Каму на Русі жыць добра».
**18.45** «Слава за хвіліну».
**19.45** «Цік-так».
**20.00** Лепшае з «Джэнтльмен-шоў».
**21.00** «Бушыдо — шлях воіна». Серыял.
**22.00** «Паўночнікі».

**7.00** «Сад і агарод плюс».
**7.15, 10.55, 21.05, 23.50** «Метэапрагноз».
**7.20 Маст. фільм «Прышэльцы».**
**9.00** «Дом жывых гісторый».
**9.30** «К-відэа» для дзяцей.
**9.50 Серыял «Нікіта».**
**10.40** «Музпарад».
**11.00 Маст. фільм «Чыста англійскае забойства».**
**13.00** «Дзённы тэлечат».
**16.30** «Жыццё, поўнае радасці».
**17.00** Мультпарад.
**17.10 Маст. фільм «Асенні марафон».**
**19.00** «Падарожжа з густам».
**19.30** «Сад і агарод».
**19.40, 21.25** «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
**19.45 Серыял «Чынгіз-хан».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Навіны кіно».
**21.10** «Каралі муай тай».
**21.30 Маст. фільм «Кароль Сіама».**
**23.55** «Начны тэлечат».

**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**9.05** «Мой сярэбраны шар. Ірына Мурзаева».
**9.55 Серыял «Віола Тараканава. У свеце злачынных страсцяў».**
**10.45, 13.45** Весткі. Дзяжурная часць.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30, 14.10** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.50 Серыял «Целаахоўнік».**
**12.45 Серыял «Пяшчотная пачвара».**
**14.30 «Кулагін і партнёры».**
**15.00** Суд ідзе.
**16.00 Серыял «Марш Турэцкага».**
**17.20** Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
**17.45 Серыял «Анёлахоўнік».**
**18.50, 23.00** Весткі—Беларусь.
**19.15** «Пятая студыя».
**19.50** Добрай ночы, малышы!
**20.00** «Вясёлы вечар «Аншлага».
**21.05 Маст. фільм «І грымнуў гром».**



*2055 год. Камерцыйная фірма арганізоўвае для багатых турыстаў паляванне на дыназаўраў. Але «эфект матылька», памножаны на мільёны гадоў, змяняе да непазнавальнасці свет, у які вяртаюцца турысты.*

**23.10 Камедыя «Цудоўная Рыта».**
**0.45 Драма «Далорэс Клейборн».**

**6.00** «Сёння раніцай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**9.05** «Наша ўсё!».
**10.20** «Ліхія 90-я».
**10.50** «Крымінальная Расія».
**11.20 Серыял «Таксістка».**
**13.25 Серыял «Оперы. Хронікі забойнага аддзела».**
**14.25 Серыял «Эра Стральца».**
**15.20** «Асарці».
**15.30** «Агляд. Выратавальнікі».
**16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.45** «Следства вялі...».
**20.45** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.15 Меладрама «Мемуары гейшы.**
*Пра лёс адной з самых славутых гейш XX стагоддзя Ніты Саюры.*
**23.55 Трылер «Барвовыя рэкі-2: Анёлы апакаліпсіса».**

**5.00** Канал «Настрой».
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30** Падзеі.
**7.50, 10.15, 23.20** Пятроўка, 38.
**8.00, 13.45, 18.50** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**8.05 Маст. фільм «Сельскі ўрач».**
**10.45 Камедыя «Амерыканскі дзядуля».**
**12.25 «Зорка эпохі». Серыял.**
**13.50** Небяспечная зона.
**14.30 «Закон Вольфа». Серыял.**
**15.30** Новая «Часінка».
**16.55** Дзелавая Масква.
**17.15** Нашы любімыя жывёлы.
**17.50 «Гарадскі раманс». Серыял.**
**18.55** «У цэнтры ўвагі». «Украсці шэдэўр».
**20.05 Баявік «У імя помсты».**
**21.55** Момант ісціны.
**22.50** Падзеі. 25-я гадзіна.
**23.40 Маст. фільм «Час развітання».**
**1.20 «Адна справа на дваіх». Серыял.**
**2.20 «24-25» не вяртаецца». Маст. фільм.**
**3.45** Мультпарад.

**9.30** «Уцёкі».
**10.00** Спідвей.
**11.00** Веласпорт.
**12.30, 14.00** Футбол. Кубак свету.
**13.45** Ралі.
**15.00, 20.30, 1.30** Лёгкая атлетыка.
**17.00, 19.30** Тэніс.
**19.00, 1.00** Футбол.
**22.00** Самыя дужыя людзі планеты.
**23.00** Рэстлінг.
**0.30** Экстрэмальны спорт.

## ФІЛЬМ ДНЯ

### ТБЦ 23.40 «ЧАС РАЗВІТАННЯ» (ФРАНЦЫЯ, 2005 г.)

Малады фатограф даведваецца, што ён смяротна хворы. Гэта прымушае яго перагледзець сваё жыццё і адносіны з блізкімі яму людзьмі. Ён згаджаецца на нечаканую просьбу незнаёмых яму людзей стаць біялагічным бацькам іх дзіцяці і адпраўляецца да мора.

**Рэжысёр** — Франсуа Азон. **У ролях:** Мельвіль Пупо, Жана Маро, Валерыя Бруні Тэдэскі, Даніэль Дзюваль, Лоранс Рагон.



# СУБОТА, 29 ВЕРАСНЯ

**6.30** КомпаС.
**6.55** Раўнавага: асяроддзе пражывання.
**7.25** Існасць.
**7.50** Добрай раніцы, Беларусь!
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.05** «Здароўе».
**9.45 Серыял «Сям'я».**
**10.15** Шпілька.
**10.50** Тайны смак.
**11.25** Ранішняя хваля.
**12.10 Меладрама «Арол і рэшка».**
**13.50** Мультфільм.
**14.00** Відэафільм АТН «Людзі на граніцы». «Грыбны рай».
**14.30** Алімпійская віза. На шляху да Пекіна-2008.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Мужыкі.
**15.55** Славянскі базар у Віцебску-2007.
**16.50** Зона Х.
**17.10** Вакол планеты.
**18.00** «Ваша лато».
**19.10 Камедыя «Жаніх напракат».**
**21.00** Панарама.
**21.40 Меладрама «Мне не балюча».**
**23.40** Формула-1. Гран-пры Японіі. Кваліфікацыя.
**0.55** Музычны плей-оф.

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00. 9.00, 16.00, 20.30, 3.00** Нашы навіны.
**9.05 Серыял «Сябры».**
**9.40** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.05** Мультсерыял «Фрэд пячорны чалавек».
**11.15** Дак. серыял «Чароўнасць дамашніх гадаванцаў».
**11.50** «Уладзімір Этуш. «Усё, што нажыта непасільнай працай».
**12.50** «Тэлечасопіс «Саюз».
**13.20 Камедыя «Сабака на сене».**
**16.10, 21.00, 3.20** Навіны спорту.
**16.15** «Яўген Мартынаў. Загавор лёсу».
**17.20** Суботні «Ералаш».
**17.30 Том Хэнкс у фільме «Нічога агульнага».**
**20.00** Вялікая палітыка.
**21.05** «Ледніковы перыяд».
**23.45** Рок-канцэрт.
**1.50** «Максім Галкін. О, шчаслівчык!».
**3.25** Эдвард Радзінскі. «Загадкі гісторыі. Іаан Мучыцель».
**4.05** «Вяртанне дамоў. Валерый Залатухін. Быстры Істок. Алтай».
**5.00** «Таблетка маладосці». Дак. фільм.
**5.40 Камедыя «Сем старых і адна дзяўчына».**

**7.35** Дабравест.
**8.00** Дак. серыял «Мільён пытанняў аб прыродзе».
**8.15 Фільм-казка «Залатавалоска».**
**9.50 Серыял «Вось так мы жывём».**
**10.15** Добрыя навіны.
**10.55** Школа рамонту.
**11.55** «Тэатр. Выбранае».
**12.40 Камедыя «Сільва».**
**15.25** «Алімпійская гісторыя». Атланта 1996 г.
**16.20** «Спорт, спорт, спорт...». Таццяна Драздоўская.
**16.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Уіган—Ліверпуль.
**19.00** «Святло далёкай зоркі. Пётр Макаль».
**19.30 Драма «Італьянец».**
**21.15** Анекдот. LAD.
**21.45** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
**23.35** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Паўфіналы.

**7.00** «Ваенная тайна».
**7.45** «З дакладных крыніц».
**8.00** «Прыгоды кенгуранят». Мультсерыял.
**8.25 Камедыя «Набожная Марта».**
**9.40** «Наш дом».
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.50 «Салдаты 3». Серыял.**
**13.35 Маст. фільм «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана»: «Дваццатае стагоддзе пачынаецца».**
**15.05** «Народжаныя ў СССР».
**15.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**16.40** «Лёсам напісаныя радкі».
**17.10** «Відзьма-нявідзьма».
**17.45** «Наша справа».
**17.55** «Неверагодныя гісторыі».
**18.25** «Рэтраманія».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Здзелка».**
**22.10** «Вуліца Гогаля».
**23.00 Драма «Вар'яцтва кахання».**
*1504 год, памерла каралева Іспаніі Ізабела, і карона перайшла яе дачцэ Хуане. Каб правіць самому, яе муж Філіп вырашае дабіцца афіцыйнага прызнання поўнай адсутнасці памяці ў каралевы.*
**1.05** «Рэкламны аблом».
**1.30 Камедыя «Брыс цудоўны».**

**4.00** Любімыя акцёры.
**4.15, 12.15 Маст. фільм «Маладая гвардыя». 1-я частка.**
**6.00, 17.00 Серыял «Душачка Моніка».**
**6.30** Удачная пакупка.
**6.45, 15.00** Дак. серыял «Хіт-парад дзікай прыроды».
**7.45** «Сямейны альбом».
**8.00** Мультсерыял «Шоу Нудніка».
**8.25** Мультсерыял «Персей».
**9.00** «Мільён пытанняў аб прыродзе».
**9.15** Дак. фільм «Шчаслівае жыццё пана дэ Бетанкура».
**10.00** «Мар, дзейнічай, будзь!».
**10.30** Ведаем рускую.
**11.30, 14.30, 17.30, 20.30** «Навіны Садружнасці».
**12.00** Любімыя акцёры.
**14.00** Студыя 60х90.
**14.10** Казахстан: старонкі гісторыі.
**16.00** «Аднакашнікі».
**18.00 Маст. фільм «Звярыная натура».**
**21.00 Маст. фільм «Хто я для цябе?».**
**0.00 Серыял «Да апошняй хвіліны». 1-я серыя.**

**9.00** «Сад і агарод».
**9.05, 21.00, 23.30** «Метэапрагноз».
**9.10** «Адзінка ў кубе».
**9.30, 15.00** Мультпарад.
**9.55** «К-гульня».
**10.00** «Каралі муай тай».
**10.15 Маст. фільм «Кароль Сіама».**
**11.50, 19.50 Серыял «Чынгіз-хан».**
**12.45** «Сямейны экран».
**14.30** «Змяні свой свет».
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Маст. фільм «Адкрытая прастора».**
**19.30** «Сад і агарод плюс».
**19.45, 21.10** «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
**20.45** «Вечарніца».
**21.15 Маст. фільм «К-19».**
**23.35** «Начны тэлечат».

**7.00, 11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**7.10** Добрай раніцы, Расія!
**8.15** Фитиль.
**9.00** «Ваенная праграма».
**9.20** «Студыя «Здароўе».
**9.55** Ранішняя пошта.
**10.25** Гарадок. Дайджэст.
**11.10** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.20** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.15** «Суботнік».
**13.00** «Вакол свету».
**14.25 Дэтэктыў «Кантрабанда».**
**16.00** «Нацыянальны інтарэс».
**16.50** «Яе лядовая Вялікасць. Алена Чайкоўская».
**17.40** «Танцы на лёдзе. Ваш выбар».
**18.05** «Суботні вечар».
**20.15** «Рэвізор».
**20.50 Маст. фільм «Мужчына павінен плаціць».**
**22.45 Баявік «Матрыца: рэвалюцыя».**

**8.00, 10.00, 13.00, 16,00, 19.00** Сёння.
**8.15 Серыял «Легенда пра чорнага рыцара».**
**9.05** «Агляд».
**9.30** «Без рэцэпта».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.30** «Асабліва небяспечны!».
**14.05 Камедыя «Мы з джаза».**
**16.25** «Жаночы погляд». Юрый Любімаў.
**17.00 Баявік «Ямакасі-2: Дзеці ветру».**
**19.40** «Прафесія — рэпарцёр».
**20.20** «Праграма Максімум».
**21.35** «Рускія сенсацыі».
**22.30** «Ты не паверыш!».
**23.30 Камедыя «Кароль вечарынак-2».**



*Студэнт-няўдачнік стварае альтэрнатыўную тусоўку галоўных прыдуркаў універсітэта, якая пачынае адціскаць элітнае студэнцкае брацтва.*

**1.15** «Рэальная палітыка».
**1.45** «Мікс-Файт М-1. Баі без правілаў».

**4.30 «Дарога да сябе» Маст. фільм.**
**7.00** АБВГДэйка.
**7.30** Праваслаўная энцыклапедыя.
**8.00** «Жывая прырода». «Гарыла».
**8.45, 13.45** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**9.10 «Казка, расказаная ўначы». Маст. фільм.**
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 22.20** Падзеі.
**10.50** «Рэпарцёр».
**11.05** «Украіна. Паўтарэнне пройдзенага». Дак. фільм.
**11.50** Лінія абароны.
**12.40** Гарадскі сход.
**13.55** Тоні Блэр у фільме Леаніда Млечына «Мядовы месяц з героем-палюбоўнікам».
**14.45 Маст. фільм «Мера спынення».**
**16.45** Пятроўка, 38.
**17.00** «Гарачыя кропкі халоднай вайны». «Ваенна-марское процістаянне».
**18.00 «Чыста англійскае забойства». Серыял.**
**20.00** «Пастскрыптум».
**21.10** «Народ хоча ведаць».
**22.40 Маст. фільм «Кліент».**
**1.00 «У імя помсты». Баявік.**
**2.50 Маст. фільм «Кава і цыгарэты».**
**4.25** Мультфільм.

**9.30** Футбол. Еўрагалы.
**10.00, 17.15** Веласпорт. Чэмпіянат свету.
**13.45** Лёгкая атлетыка.
**15.00, 19.30** Тэніс. Турнір WTA.
**16.45** Ралі.
**19.00** «Eurosport Buzz».
**21.00** Вось гэта дзіва!!!
**21.45** Кікбоксінг.
**0.30** Рэстлінг.
**2.00** Снукер.

## ФІЛЬМ ДНЯ

### ПЕРШЫ 21.40 «МНЕ НЕ БАЛЮЧА» (РАСІЯ, 2006 г.)

*Узнагароды:* Гран Пры і прызы на КФ «Кінатаўр» (Сочы, 2006 г.), залаты прыз XIII Мінскага МКФ «Лістапад» (2006 г.), галоўны прыз «Вялікая залатая ладдзя» на КФ «Акно ў Еўропу» ў Выбаргу (2006 г.).

Што можа быць больш балючым, чым непераадольнае жаданне жыць і кахаць, калі смерць зусім блізка?

**Рэжысёр** — Аляксей Балабанаў. **У ролях:** Рэната Літвінава, Аляксандр Яцэнка, Дзмітрый Дзюжаў.



# БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

## Адзінец



У блакітным полі срэбная страла наканечнікам уверх, перакрыжаваная, ніжні канец зламаны.

Гербам АДЗІНЕЦ карысталіся:

Адзінец, Адынец, Бараноўскі, Богуш, Бурба, Віславух, Дабравольскі, Драбовіч, Расалоўскі, Рыкала, Шастоўскі, Шышка.

## Анцута



У белым полі залатая страла з чорным наканечнікам, ніжні канец раздвоены, па баках срэбны маладзік рагамі да стралы і срэбная васьмікутная зорка.

Гербам АНЦУТА карысталіся:

Анцута, Анчыц, Гаўрылкевіч, Есіповіч

## Аксак (Прыяцель)



У блакітным полі чырвонае сэрца на срэбнай місе, прабітае наўскос злева направа зверху ўніз залатой стралой са срэбным апярэннем і наканечнікам.

Гербам АКСАК (ПРЫЯЦЕЛЬ) карысталіся:

Акінчыц, Аксак, Асановіч, Бернатоўскі, Бутовіч, Вайцяховіч, Вуловіч, Галькоўскі, Грабоўскі, Гружэвіч, Грыневіч, Даўнаровіч, Дулеўскі, Карабановіч, Кудзіновіч, Ліпінскі, Лук'яновіч, Лук'янскі, Лядніцкі, Мацкевіч, Мусніцкі, Паўловіч, Прышыхоўскі, Раманоўскі, Скірмунт, Тамковіч, Шэмбель, Юроўскі, Яновіч.

## Асарыя



У чырвоным полі залатое кола ад воза без верхняй чвэрці, у прагале залаты крыж чатырохканцовы, забіты ў ступіцу.

Гербам АСАРЫЯ карысталіся:

Адорскі, Альшэўскі, Брахоцкі, Букоўскі, Буш, Гардыка, Глінскі, Грушэвіч, Гурскі, Еўлашэўскі, Златніцкі, Кавалеўскі, Каламыйскі, Канарскі, Кандрацкі, Касэцкі, Красоўскі, Кола, Ласоўскі, Мятальскі, Пяскоўскі, Пяшкоўскі, Русецкі, Стадніцкі, Стрыжэўскі, Тваркоўскі, Твербус, Траяноўскі, Тэраўскі, Цярпіцкі, Чапялінскі, Чэшык, Яноўскі.

**Рубрыку вядзе Уладзімір КРУКОЎСКІ.**

Інфарм-укол

# НЕ ДАПУСЦІМ ДЫЯБЕТУ!

1. Магній — галоўны мікраэлемент у арганізме. Жанчыны, якія прытрымліваюцца дыет з высокім працэнтам магнію, знізілі рызыку захварэць на дыябет амаль на 48 працэнтаў. А недастатковае спажыванне магнію павялічвае рызыку больш як на трэць.

2. Даследаванні паказалі, што неабходная колькасць хрому (200—1000 мг у дзень) дапамагае знізіць узровень цукру ў крыві. Дзякуючы хрому, змяншаецца і працэнт тлушчу ў арганізме. У рацыёне 90 працэнтаў людзей прысутнічае 25 мг гэтага мікраэлемента. Так, у шклянцы нарэзанай брокалі ўтрымліваецца 11 мг хрому, у кексе з пшанічнай мукі — 4 мг, у 100 г грудкі індычкі — 3 мг, шклянцы зялёных бабоў — 2 мг, у банане сярэдняга памеру — 1 мг. Каб папярэдзіць дыябет, неабходна ўжываць 200 мг хрому ў дзень, а пры першых сімптомах захворвання падвоіць гэту норму.

3. Цэльнае зерне — крыніца хрому і магнію, але гэта не адзіная прычына, па якой яно «кідае выклік» дыябету. Пасля ежы валокны зерня запаўняюць страўнік, але не забіваюць яго. Яны пераграўліваюцца даўжэй, чым ачышчанае зерне белага хлеба, і гэта дапамагае падтрымліваць пастаянны ўзровень цукру. Вось што тут можна параіць: з'ешце на снядана аўсянку, на абед — бутэрброд з зерневага хлеба, а на вячэру прыгатуйце паўшклянкі карычневага або неачышчанага рысу.

4. Узровень цукру ў крыві можна панізіць, калі дадаць палову чайнай лыжкі карыцы ў малочны кактэйль.

5. Самы прымальны варыянт для папаўнення вітаміну Д — атрымліваць яго з вітамінізаваных прадуктаў: малака, апельсінаў, аўсяных шматкоў.

**НЕБЯСПЕЧНАЯ ЧАЦВЁРКА**

З пункту гледжання развіцця дыябету 2-га тыпу не існуе адназначна шкодных прадуктаў — усё пытанне ў колькасці.

*Найперш дыетолагі раяць істотна змяншаць колькасць ужывання цукру, хоць і не выключаць яго ўвогуле.

*Было ўстаноўлена, што паўтары шклянкі віна ў дзень зніжаюць рызыку развіцця дыябету 2-га тыпу, а дзве шклянкі патройваюць рызыку.

*Тлушч, ачышчаны крухмал, цукар і крыху бульбы — вось ён, гамбургер, які не абяцае нічога добрага нашаму здароўю.

*Той, хто ўжывае бекон 2 разы ў тыдзень, павялічвае шанц развіцця дыябету 2-га тыпу амаль на 20 працэнтаў у параўнанні з тымі, хто ўжывае толькі 1 раз. А тыя, хто двойчы на тыдні ўжывае сасіскі або хот-догі, павялічвае сваю рызыку на 25 працэнтаў.

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

проводит открытый аукцион по продаже котла парового ДЕ-16/14 МГ (1990 г.в.) Начальная цена снижена на 20% и составляет 150 256 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» 14.06.2007 г. Аукцион состоится 09.10.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 08.10.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны (8017) 2246134, (801716) 71431.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

**ОАО «МОСТООТРЯД № 88» ТРЕБУЮТСЯ:**

- Крановщики
- Водители
- Копровщики
- Монтажники строительных конструкций
- Рабочие других строительных специальностей.

**Зарплата от 700 000 рублей.**

*Обращаться по телефонам: приемная: 8(017)204-84-77, гл. инженер: 8-029-687-72-51.*

Сардэчна віншуем з залатым вяселлем **Надзею Пятроўну і Пятра Сцяпанавіча ЛЯЎШУКОЎ** з в. Капошчава.

*Жыццё пражыць —*
*не поле перайсці...*
*Дык будзь жа бласлаўлёным тое поле,*
*Вам, па якім*
*наканавана доляй*
*Назад не павяртаючы ісці.*

**Вера, Лена,** *в. Галынь.*

# УЦЕКАЧА ЗАТРЫМАЛІ Ў САНКТ-ПЕЦЯРБУРГУ

**У Расіі затрыманы крымінальнік, які больш за 9 гадоў адшукваўся праваахоўнікамі за ўчыненае ў Беларусі злачынства.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, жыхар Северадзвінска падазраваўся ў забойстве ў 1998 годзе мінчаніна. З мая таго ж года ён знаходзіўся ў міждзяржаўным вышуку. І вось супрацоўнікам УФСБ РФ па Санкт-Пецярбургу і Ленінградскай вобласці ўдалося затрымаць падазронага. Зараз вырашаецца пытанне аб яго экстрадыцыі ў нашу краіну.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# НЯДЗЕЛЯ, 30 ВЕРАСНЯ

**7.00** «Край чыстай вады». Дак. фільм.
**7.25** Формула-1. Гран-пры Японіі.
**9.25, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.30** Арсенал.
**10.00 Серыял «Сям'я».**
**10.35** Культурныя людзі.
**11.05** Дак. серыял «Маленькі чалавек». «Мысленне».
**12.10 Драма «Бабуся».**
**14.05** Відэафільм АТН «Людзі на граніцы». «Беларуская тундра».
**14.30** Футбол. Часопіс Лігі чэмпіёнаў.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Зорны старт. Дзённік дзіцячага Еўрабачання.
**15.40** Час кіно.
**16.10** КВЗ. 1/3 фіналу Еўраліг і.
**18.00** Суперлато.
**19.00 Камедыя «Шалёныя скачкі».**
**21.00** Панарама тыдня.
**22.05** Вось дык шоў!
**23.05 Меладрама «Галава ў аблоках».**
*Гэта тройца была шчаслівая ў Парыжы ў свеце свецкіх забаў, пакуль не грымнула другая сусветная вайна. Іх шляхі разышліся, але, як аказалася, не надоўга.*
**1.10** Усе стыхіі.

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 3.00, 5.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная прапаведзь.
**9.20 Серыял «Сябры».**
**10.00** «Бесталковыя нататкі».
**10.20** Пакуль усе дома.
**11.15** Фазэнда.
**11.50** «Ранішняя пошта».
**12.30** Дак. серыял «Гэтыя цудоўныя жывёлы».
**13.30** Нядзельны «Ералаш».
**13.50** «Хвіліна славы».
**16.15, 3.10** Навіны спорту.
**16.20** «Міжнародная панарама».
**16.40 Маст. фільм «Вы не пакінеце мяне...».**
*Гісторыя актрысы і яе мужа, тэатральнага мастака, які падыходзіць ёй як бацька.*
**18.40** Рэаліці-шоў «Тры халасцякі».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Сольны канцэрт Тота Кутуньё».
**23.10** «Фабрыка зорак».
**1.00** «Камедзі Клаб».
**1.35 Маст. фільм «Узброены і небяспечны».**
**3.15 Маст. фільм «Летуценніца».**
**5.05** «Зорныя разводы».

**7.45** Мір вашаму дому.
**8.00** Наша пяцёрачка.
**9.05** Дак. серыял «Невядомая планета». «Шлях Дао».
**10.05, 12.35, 0.50** Прасоўванне+.
**10.20** Школа рамонту.
**11.20** Сезон у дачы.
**12.05** Гаспадар.
**12.50** Слова пісьменніка.
**13.20** Іраклій Андронікаў расказвае... «Альбом Адоеўскага».
**14.25 Меладрама «Шклянка вады».**
**16.55** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў ЕГФ. «Босна» (Сараева, Боснія і Герцагавіна)—БГК імя Мяшкова (Беларусь).
**18.35** Анекдот. LAD.
**18.55** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Мінск)—«Нёман».
**20.55** Тэлебарометр.
**21.15 Дэтэктыў «Смяротныя гульні».**
**23.00** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Фінал.

**6.35 Фільм-казка «Асліная шкура».**
**7.55 Камедыя «Набожная Марта».**
**9.10** «Аўтапанарама».
**9.35** «Схема смеху».
**10.25** «Вялікае снеданне».
**11.00** «Новыя падарожжы дылетанта».
**11.30** «Добры дзень, доктар!».
**12.00** «Салдаты. Навыварат». Фільм аб серыяле.
**13.00** «Гучная справа»: «Авіякатастрофы. Формула падзення».
**13.50 Маст. фільм «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана»: «Дваццатае стагоддзе пачынаецца».**
**15.15** «І Вам пры встрече я скажу...» Міжнародны тэатральны фестываль «Галасы гісторыі» ў г. Волагда.
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**18.20** «Прыватныя гісторыі».
**19.05** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень з Аленай Хадаронак».
**20.40 Маст. фільм «Два жыцці».**



*Блукаючы ў сне і наяве, Марці-Мары страчвае сувязь з рэальным светам, не ведаючы, што існуе на самай справе, а што — толькі плод яе фантазіі.*

**22.40** «Спартыўны тыдзень».
**23.10** «Прафесійны бокс».
**0.10** «Па поўнай праграме».
**0.50 Уцёкі». Серыял.**
**1.30** «Бла-бла-шоў».

**4.00** Любімыя акцёры.
**4.15, 12.15 Маст. фільм «Маладая гвардыя». 2-я частка.**
**6.00, 17.00 Серыял «Душачка Моніка».**
**6.30** Удачная пакупка.
**6.45, 15.00** Дак. серыял «Таямнічыя кругі».
**7.45** «Прырода-лекар».
**8.00** Мультсерыял «Шоу Нудніка».
**8.25** «У гасцях у Мінуткі»
**9.00** Даведнік.
**9.30** «Хіт-экспрэс».
**10.30** «Хвост каметы»:
**11.30, 14.30** «Навіны Садружнасці».
**12.00** Любімыя акцёры.
**14.00** «Праваслаўная сталіца».
**16.00** Паэзія Арменіі.
**16.15** Любоўныя гісторыі.
**16.45** Арт-рэвалюцыя.
**17.30** «Без палітыкі».
**18.00** «Простыя лічбы».
**18.30** У нашу гавань заходзілі караблі.
**19.30** Спецыяльны рэпартаж.
**20.00** «Разам».
**21.00 Маст. фільм «Агні рампы».**
**23.00 Серыял «Да апошняй мінуты».**

**9.00, 19.40** «Сад і агарод».
**9.05, 23.15** «Метэапрагноз».
**9.10** «Адшукваецца адпачынак».
**9.30** «Гурман-клуб».
**9.55** «К-гульня».
**10.00** «Мой любімы гадаванец».
**10.30 Маст. фільм «К-19».**
**12.45,19.50 Серыял «Чынгіз-хан».**
**13.30** Дак. серыял «Жывая прырода».
**14.30** «Добрая вестка з Рыкам Рэнерам».
**15.00** «К-відэа для дзяцей».
**15.20 Фільм для дзяцей.**
**16.40 Серыял «Эркюль Пуаро».**
**17.35 Маст. фільм «У люстэрка два твары».**
**19.45, 21.20** «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Аўтасхватка».
**21.25 Маст. фільм «Чумавая пятніца».**

**7.00, 11.00, 14.00** Весткі.
**7.10, 14.20** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**7.20 Маст. фільм «Два доўгія гудкі ў тумане».**
**8.45** Мультфільмы.
**9.00** «Дыялогі пра жывёл».
**9.30** «Формула ўлады».
**10.00** «Сто да аднаго».
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** «Загрымець пад фанфары... Барыс Новікаў».
**13.05** «Аншлаг і кампанія».
**14.30 Маст. фільм «Прыезджая».**
**16.30** «Сумленны дэтэктыў».
**17.05** «Танцы на лёдзе».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.00** «Спецыяльны карэспандэнт».
**20.30 Маст. фільм «Сітуацыя 202. Асобы перыяд».**
**22.35 Камедыя «Адбіўныя».**
**0.25** «Гарачая дзесятка».

**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.15 Серыял «Легенда пра чорнага рыцара».**
**9.05** «Шчаслівы рэйс».
**10.25** «Ядзім дома!».
**11.05** «Усё адразу!».
**11.40** «Іх норавы».
**12.10** «Авіятары».
**12.40, 20.35** «Надзвычайнае здарэнне».
**13.25** «Ліхія 90-я».
**14.05 Камедыя «Формула кахання».**
**16.25** «Адзін дзень. Новая версія».
**17.05 Камедыя «Ландыш серабрысты».**
*Зоя непрыгожая, нявыхаваная і надта простая, але калі яна ўпершыню адкрывае рот каб праспяваць, вось тут прадзюсары і прызадумваюцца. І пачынаецца карпатлівая праца па стварэнню лебедзя з брыдкага качаняці.*
**19.00** «Сёння. Падагульняючая праграма».
**19.50** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**21.20** «Галоўны герой».
**22.30** «Нядзельны вечар».
**23.40 Трылер «Разрыў».**

**4.55 Маст. фільм «Хроніка пікіруючага бамбардзіроўшчыка».**
**6.30** Права на надзею.
**6.55** Дзённік падарожніка.
**7.25** Сялянская застава.
**8.00** «Жывая прырода». «Паляўнічыя на раўнінах».
**8.45** «21 кабінет».
**9.20** Нашы любімыя жывёлы.
**9.55** «Рэальныя гісторыі». «SOS!».
**10.30, 23.15** Падзеі.
**10.40 Камедыя «Шчодрае лета».**
**12.25** Наташа Каралёва ў праграме «Запрашае Барыс Ноткін».
**12.55** «Дэтэктыўныя гісторыі». «Хлеб. Грошы. Пісталет».
**13.30** Падзеі. Маскоўскі тыдзень.
**14.05** «Лакальная незалежнасць: абхазскі варыянт». Спецрэпартаж.
**14.25** «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. «Як зняць кватэру?».
**15.15** Дак. фільм «Мужчынская чароўнасць Алега Яфрэмава».
**16.00 Маст. фільм «Капальні цара Саламона».**
**18.00 Камедыя «А раніцай яны прачнуліся».**
*Восем герояў фільма прачынаюцца раніцай у выцвярэзніку і кожны ўспамінае, як менавіта ён туды трапіў.*
**20.00** «У цэнтры падзей».
**21.05 Дэтэктыў «Пуаро Агаты Крысці».**
**23.35 Баявік «Прышэлец».**
**1.35 «Атэль «Эдэм». Маст. фільм.**
**3.10 «Мера спынення». Маст. фільм.**
**4.25** Мультфільм.

**9.30** «Eurosport Buzz».
**10.00** Аўтагонкі.
**11.45, 17.00** Веласпорт. Чэмпіянат свету.
**15.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Фінал.
**18.30** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**19.30** Тэніс. Турнір WTA. Фінал.
**22.45** Мотаспорт па выхадных.
**23.15** Пляжны валейбол.
**0.45** Бокс.

***У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!***

## ФІЛЬМ ДНЯ

### РТР 22.35 «АДБІЎНЫЯ» (ФРАНЦЫЯ, 2003 г.)

Два старыя халасцякі выпадкова сустракаюцца адночы вечарам. За вячэрай яны высвятляюць, што ў іх шмат агульнага. Іх хатнія работніцы — гэта адна і тая ж жанчына. І вось тут пачынаецца адна з самых незвычайных і рызыкоўных прыгод у іх жыцці. Сівізна ў бараду, чорт — у рабрыну!

**Рэжысёр** — Бертран Бліе. **У ролях:** Філіп Нуарэ, Мішэль Буке, Фарыда Рахуадзі, Катрын Ігель.



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.376. Індэкс 63850. Зак. № 5162. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12